Брава, ЗБМ!!! ☞ 3

Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

PL ISSN 0546-1960

NR INDEKSU 366714

Вечар у Нарве ☞ 12

http://niva.iig.pl

redakcja@niva.iig.pl

№ 09 (2755) Год LIV | Беласток, 1 сакавіка 2009 г. | Цана 2,00 зл. (VAT 0%)

З клопатам пра меншасці

Размова з Анатолем Вапам — дырэктарам дэпартамента культуры і нацыянальнай спадчыны Падляшскай маршалкоўскай управы.

„Ніва”: — ***Якія прыярытэты абавязвалі пры назначанні датацый з сёлетняга бюджэту падляшскага самаўрада на заданні ў галіне культуры?***

Анатоль Вап: — Былі яны падобныя на мінулагоднія. Разам іх 12. Вылучана заданне „Падтрымка аматарскага мастацкага руху”. Першапачаткова ўваходзіла гэта ў склад „рэалізацыі культурных мерапрыемстваў высокамастацкага рангу”. Не было гэта адпаведным, паколькі апрача праектаў вялікіх мерапрыемстваў падаваліся праекты імпрэз невялікіх, ды вельмі каштоўных, напрыклад, такіх, што рэалізаваліся на вясковай тэрыторыі. Другой навінкай з'яўляецца ўвядзенне прыярытэту датычнага будавання міжкультурнага дыялога.

— ***Колькі грошай і на колькі праектаў агулам у гэтым годзе ПМУ прызначыла на культуру, а колькі з гэтага на праекты нацыянальных меншасцей, асабліва беларускай меншасці?***

— Мы прынялі прынцып, што большасць грошай была размеркавана яшчэ напрыканцы мінулага года так, каб культурныя падзеі, якія маюць быць рэалізаваныя сёлета, маглі быць здзейснены, нават тыя, што праводзіліся ў студзені. Калісь тыя імпрэзы, што агранізаваліся ў студзені, а нават у палове лютага не мелі шанцаў на рэалізацыю, паколькі не можам бенефіцыентам кампенсаваць затрачаных коштаў, а толькі дафінансоўваць тыя імпрэзы, якія маюць адбыцца. На 2009 г. ужо ў снежні было размеркавана 1 млн. 205 тыс. зл. На апошняе размеркаванне датацый было пададзена больш за трыста прапаноў на суму каля 7 млн. зл. Мы тады ўжо размеркавалі дзве траціны сёлетніх грошай, паколькі большасць мерапрыемстваў праводзіцца ад студзеня да снежня. На дататковы конкурс, які абвесцім у красавіку, прызначана 400 тыс. зл., на падзеі, якія адбудуцца ў другой палове года. У сувязі з тым, што было так шмат заяў, прытым вельмі цікавых, а першапачатковая сума была замалая, управа ваяводства рашыла абвясціць яшчэ адзін дадатковы конкурс [рашэнне аб яго абвяшчэнні вядомае ад мінулага тыдня — М. Х.]. Значыць, агулам на бягучы год на датацыі ў галіне культуры прызначаем 1 млн. 700 тыс. зл.

— ***Вярнуся, аднак, ды пытання: колькі грошай і на колькі мерапрыемстваў атрымаюць меншасныя арганізацыі, асабліва беларускія?***

— У гэтым месцы хачу падкрэсліць, што нацыянальныя меншасці могуць падаваць прапановы на рэалізацыю заданняў ва ўсіх 12 прыярытэтах, а не толькі на „Падтрымку ініцыятыў нацыянальных меншасцей”. Агранізацыі нацыянальных меншасцей (у тым ліку адна ўстанова — літоўская) атрымалі датацыі на рэалізацыю 33 заданняў на суму 224 тыс. 500 зл., сярод іх беларускія — 151 тыс. зл. на 25 заданняў. Да таго адзін праект, „Вялікае Княства літоўскае — наша супольная спадчына” рэалізуюць разам беларусы і літоўцы. Тут хачу адзначыць, што гэта адзін з самых цікавых праектаў якія сёлета паступілі ў Маршалкоўскую ўправу. Гэта не ўсе, аднак, грошы, якія атрымалі нацыянальныя меншасці. Шмат мерапрыемстваў арганізуюць іншыя арганізацыі і гмінныя асяродкі культуры, напрыклад, беларускія імпрэзы арганізуюць асяродкі культуры ў Чыжах, Нарве, Нараўцы, Орлі і Заблудаве. Атрымалі яны дафінансаванне на рэалізацыю 7 заданняў. Беларускія арганізацыі атрымліваюць таксама дафінансаванне на рэалізацыю заданняў ваяводскага характару, напрыклад, Звяз беларускай моладзі на падрыхтоўку Падляшскага культурнага шляху „Дрэва і сакрум”.

— ***А якая адноснасць сёлетніх датацый для меншасцей у параўнанні з мінулымі гадамі?***

— Напрыклад, у 2007 г. арганізацыі нацыянальных меншасцей атрымалі 96 тыс. 500 зл. на 17 заданняў, сярод іх беларускія — 82 тыс. 500 зл. на 14 заданняў. У 2008 г. было ўжо 135 тыс. 300 зл. на 25 заданняў, сярод іх на беларускія — 82 тыс. 800 зл. на 17 заданняў. Параўноўваючы з бягучым годам ясна відаць, што гэтыя сумы большаюць.

— ***Ці гміны, дзе ў большасці або ў значнай частцы пражываюць меншасці, могуць разлічваць на дапамогу, асабліва фінансавую, ПМУ, а затым Вашага дэпартамента?***

— Так, гміны трактуюцца нароўні з апошнімі. Такога тыпу гміна мусіла б мець статус гміны нацыянальнай меншасці з меншаснай дапаможнай мовай і падвойнымі назвамі. Такім прыкладам з'яўляецца Пунск, літоўская гміна, дзе дзейнічае Дом літоўскай культуры. І гэта адзіная такая гміна на тэрыторыі нашага ваяводства, якая можа старацца ў нас за грошы. Нічога не стаіць на перашкодзе, каб у нейкай з гмін узнік самаўрадавы асяродак беларускай культуры, такі як літоўскі ў Пунску.

— ***Чаму ПМУ адняла сёлетнія датацыі імпрэзам арганізаваным Беларускім грамадска-культурным таварыствам? Мы самі напісалі, што вы назначылі грошы, а пасля аказалася, што іх не будзе.***

— Фактычна, назначылі мы БГКТ 40 тыс. зл. на пяць праектаў. Ужо пасля нашага рашэння мы даведаліся, што БГКТ рашэннем МУСіА падлягае выключэнню на перыяд 3 гадоў, значыць, да 10 ліпеня б.г., з права на хадайнічанне за фінансавыя сродкі з дзяржаўнага бюджэту або адзінак тэрытарыяльнага самаўрада. У сувязі з гэтым мусілі мы адмовіцца ад нашага рашэння. Мы не ведалі гэтых акалічнасцей [БГКТ парушыла закон аб публічных фінансах — М.Х.]. Гэта для нас прыкрая і нявыгадная сітуацыя, але мусім трымацца закону. Можа, будзе яшчэ конкурс 10 ліпеня і тады БГКТ зможа старацца за грошы. Аднак з конкурсамі не можам чакаць толькі таго, каб мінуў тэрмін пакарання Таварыства.

— ***Дзякуем за размову.***

Размаўляў Мацей ХАЛАДОЎСКІ

Фота Міры Лукшы

Край мяжы... ☞ 8

Аляксандар ВЯРБІЦКІ

Бельскае УБ ☞ 9

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

ЗАПРАШЭННЕ

Фільмавае Падляшша атакуе ... Гайнаўку

Цэнтр прамоцыі рэгіёна „Чарлёнка” запрашае на дэманстрацыю аўтарскіх фільмаў з Падляшша Ірка Пракапюка і Марка Уладзімірава. Паказ адбудзецца 27 лютага 2009 г. (пятніца) а гадз. 18.00 у ЦПР „Чарлёнка”, Гайнаўка, вул. Тамары Саланевіч, 2.

... і Гарадок

27 лютага 2009 г. (пятніца) а гадз. 18.30 у Гмінным цэнтры культуры ў Гарадку адбудзецца дэманстрацыя фільмаў з цыкла „Фільмавае Падляшша атакуе”. Пасля паказу — канцэрт, прымеркаваны да 9-й гадавіны калектыву „Ріма”. Апрача юбіляраў на сцэне выступяць „5сот5” і „Сходы”. Падчас канцэрту адбудзецца прэзентацыя тэледыскаў гурту „Ріма”.

9 770546 196000

На допінгу

Сусветны спорт працягваюць трэсці допінгавыя скандалы. Здаецца, вялікі спорт як сацыяльная з'ява ўжо падышоў да сваёй крытычнай мяжы, калі ён альбо канчаткова ператворыцца ў скрозь фальшывую і крымінальную сферу па адмыванні грошай, альбо пачне ачышчацца ад гэтай суцэльнай пачварнасці. Прынамсі раптоўныя смерці прадстаўнікоў самых розных відаў спорту, якія здараюцца ўсё часцей, надзвычай абвастрылі праблему. Ужыванне допінгу ў спорце набыло ўжо такія маштабы, што пра прынцыпы незабыўнага барона Кубэртэна ўжо сорамна і згадваць. Абы перамога — „мы за ценой не постоим".

Допінг — не што іншае як сінонім і родны брат падману. У спорце гэты від ашуканства найбольш распаўсюджаны ў дзяржавах, дзе пануюць таталітарныя рэжымы. З нядаўняй гісторыі можна ўспомніць „фенаменальныя" поспехі, прыкладам, кубінскіх атлетаў ці гедэраўскіх плыўчых. Рэгулярна вызначаліся тут і прадстаўнікі іншых краін так званага сацыялістычнага лагера — найперш, канешне, СССР, а таксама Венгрыі. Цяпер, па ўсіх знешніх прыкметах, наперадзе ўсёй планеты тут Кітай, які пакуль антыдопінгавыя лабараторыі раскрыць не ў змозе (альбо не ў жаданні?). Паводле статыстыкі апошніх гадоў найбольш спартоўцаў, якія ўжывалі допінг, выяўлена ў Расіі і ЗША. Але ў гэтых прызнаных лідараў сусветнага спорту матывацыя падману істотна адрозніваецца. У амерыканцаў, як правіла, гэта паслядоўнасць асабістага выбару чалавека ў выніку крайняга культу пераможцы ў грамадстве. На што не пойдзеш дзеля асабістай славы, бо бляск залатога цяльца для заможных амерыканцаў, прынамсі, другасны. У расіян рэгулярнае ўжыванне допінгу — найперш наступства ціску дзяржаўнай сістэмы на атлета, з якога яна бязлітасна выціскае ўсё да апошняй кроплі (цяпер, праўда, у адрозненне ад СССР, яшчэ і плацяць вялікія грошы). Гэтая сістэма не лічыцца ні з маральнымі прынцыпамі, ні са здароўем людзей, ні з матывамі элементарнай справядлівасці. У Расіі тым больш традыцыйна дзеля вялікадзяржаўнай ідэі людзі — не больш чым матэрыял.

Допінг наўпрост звязаны з карупцыяй. Вось дысквалiфікавалі перад пекінскай алімпіядай пару беларускіх лёгкаатлетак. Але ж вінаватыя трэнеры і чыноўнікі спраўна атрымалі прэміяльныя грошы за псеўдадасягненні. Распісаліся ў ведамасцях і вокам не міргнулі. І толькі цяпер, дзякуючы пільнасці асобных журналістаў, усплыла пра гэта праўда і выбухнуў скандал, які вышэйшыя кіраўнікі ад спорту пастараюцца, як кажуць, „замяць" пад выглядам таго, што, маўляў, не паспелі пераафарміць бухгалтарскія паперы, што выйшла такая тэхнічная памылачка. Бо ў гэтых самых чыноўнікаў рыльца ў пуху па самыя вушы. І хоць некаторыя ў Беларусі ўсё яшчэ вераць у „добрага цара", які караючым мячом вось-вось павінен абрынуць свой праведны гнеў на галовы нядбайных кіраўнікоў галіны, аднак з народнай мудрасці добра вядома адкуль гніе рыба.

Другі прыклад — гэта „залёт" двух беларускіх прызёраў апошняй алімпіяды — кідальнікаў молата Вадзіма Дзевятоўскага і Івана Ціхана. Спярша, яшчэ ўчора ўзорных „верных ленінцаў" пасля інфармацыі пра сумны (медыцына дзіўна называе яго станоўчы) вынік амаль усе кінулі, потым пачалі ліхаманкава шукаць казлоў адпушчэння і рабіць нейкія няўклюдныя захады (так Дзевятоўскага для нечага прызналі чалавекам года на Віцебшчыне!). Кропка ў справе яшчэ не пастаўлена, але сістэма ўжо выявіла сваё аблічча.

Беларусь, як краіна, амаль уся жыве на допінгу. Многія гады наша гаспадарка не злазіць з расійскай нафта-газавай трубы-іголкі. Цяпер вось „падсадзілі" яшчэ на валютныя крэдыты з розных бакоў. Чым урэшце скончыцца такая „перадазіроўка" для хворага арганізма эканомікі, прагназаваць не хочацца. Але самы страшны від допінгу — гэта ідэалагічны. Штодзённыя тэлевізійныя „ін'екцыі" хлусні ў галовы насельнікаў краіны вывесці з арганізма найцяжэй. Фальшывая вера ці то ў масавы гераізм народа, ці то ў адзіна правільны курс дзяржавы, ці то ў мудрасць і геніяльнасць венцаносных правадыроў не праходзіць бясследна, уплывае і будзе адбівацца далей на лёсе не аднаго пакалення.

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Вачыма базарнай бабы!

Шкада базарыку на Юравецкай. Асабліва яго дзікай часткі, пра якую беластоцкі народ казаў: руска! Тут найперш выстойвалі гандляркі з-за ўсходняй мяжы, у якіх можна было танна набыць папяросы, спірт, майткі, касцюм... Але не за папяросамі хадзіла я на „рускі" рынак. Некаторыя гандляркі між сабой размаўлялі на беларускай мове. Так жа звярталіся яны і да кліентаў. За тры гады бадзяння па рынку я толькі раз сустрэла шавіністычнае шоў. На рускамоўную жанчыну напаў сіняносы гандляр папяросамі (W Polsce masz, kurwa, mówić jak człowiek!). Паколькі і яна і ён прадавалі папяросы з рукава, разборка мела прызнакі нездаровай канкурэнцыі. На шчасце ў Беластоку не звяліся джэнтльмены, якія адцягнулі зайздроснага спекулянта ды паставілі яго гандляваць у іншы куток. Гэты непрыемны ўспамін не адвярнуў маёй увагі ад рынку. Часцей за ўсё чуліся там бяседы ў духу адабрэння і зразумення. У галаве астаўся адзін кадр ад святкавання 8 сакавіка. Дзяўчаты з Гродзеншчыны распівалі свой тавар пад песню „Цячэ вада ў ярок". Ля іх кампаніі лунала аўра адабрэння і нясмелага захаплення. Праўда, на рынку пераважала публіка пенсійнага ўзросту. Той-сёй пусціў слязу, успомніў маладыя гады...

На Юравецкай пашанцавала купіць мне вышытую ў каляровыя ружы ільняную прасціну. Колеры і ўзор скрывалі ў сабе нейкі сакрэтны код кахання. Прасціну я набыла ад сціплай беларускамоўнай кабеты ад Баброўска. Я ведала, што рукадзельны цуд падару сваёй сяброўцы (як паказалася неўзабаве, гэта быў шлюбны падарунак!).

Базарык натхніў мяне і ў літаратурным сэнсе. Тут разыгралася дзея „Інспірацыі" з салярным Струком у цэнтры, якія прышыбаваў з Гародні і назіраў за паводзінамі базарнай бабы!

Самы прыгожы базар я пабачыла ў цэнтры Кішынёва. Там таксама можна было купіць усё — ад кавуноў па труну. Вабнасць базару ў яго пазіцыі і канструкцыі. Базар вызначае цэнтр сталіцы Малдовы. На першым месцы сярод тавараў — араматныя плады малдоўскай зямлі: гародніна, садавіна, сыры, мяса. І віно ў дзесятках відаў. Індывідуальныя вытворцы прадаюць яго проста з бочкі. Тут жа тоўпяцца і ўсякай масці музыканты і мастакі. У памяці застраг стары гарманіст-цыган, які іграў настальгічныя рамансы. І мноства манашак, якія збіралі спамаганне на свае манастыры. Іх убогі і аскетычны выгляд выклікаў павагу і пэўную боязь базарнага натоўпу. (Малдова — найбольш праваслаўная краіна свету, праваслаўныя складаюць 98 працэнтаў ад агульнай колькасці насельніцтва). Сур'ёзныя кадры перапляталіся тут з рыначным фальклорам. Даволі прыемна было панаціраць і за хітрыкамі ў гандлі. У гэтай сферы найбольшы талент праяўлялі армяшкі. Я назірала як прадстаўнік самай купецкай нацыі таргаваў дынямі. Плод, перш чым папасці ў рукі пакупніка, падаў на тратуар і разбіваўся. Збіты з панталыку спажывец купляў яшчэ адну дыню. Ён чамусьці вінаваціў сябе ў пашкоджанні першага прадукта.

Базар у Кішынёве цікавы толькі ў цэнтры. На абочынах прадавалі ўсё апошняе, чытайце — кітайшчыну.

Пра базар у Манрэалі я даведалася найперш па інтэрнэце. Зразумела, што калі я наведала горад, адразу рушыла ў бок вядомага рынку. Гэтае месца наведваюць найперш людзі з вышэйшых сфер: мастакі, працаўнікі ўніверсітэтаў, бізнесмены. Сам базар явіцца як твор мастацтва. На прылаўках сустрэлі мяне каляровыя кампазіцыі з гародніны і садавіны з цэлага свету (на кожным пазначаны край паходжання). Такі ж каларыт панаваў і сярод пакупнікоў — тут шпацыравалі людзі ўсіх нацый і кантынентаў. Свет у мініяцюры. Наколькі ў Кішынёве захапіў мяне пах свежай гародніны, настолькі ў Манрэалі спадабалася людская ветлівасць і эстэтыка. Часта на рынак я выпраўлялася са сваёй хроснай дачушкай па яе любімыя бубы (кітайскі плод лічы). Нас адразу запамяталі. Пасля некалькіх дзён прадаўцы ўжо здалёк першыя віталіся і частавалі нечым смачным дзіцятка. Ветлівасць і фамілійнасць у касмапалітычнай метраполіі напамінала мне ўспаміны арлянскіх старажылаў пра іх гандаль з габрэямі. Іх зносіны абапіраліся на грунт гуманнасці, арганізавалі і будавалі прастору міжнацыянальных і міжэтнічных адносін. У цывілізаваных умовах, як згаданы рынак у Манрэалі, з'явілася яшчэ патрэба эстэтыкі. Такая паслядоўнасць у прыродзе!

У тым жа самым часе ўзрывалі і бурылі базар у Беластоку. З канадскай перспектывы яшчэ больш яго стала шкада. Асабліва той рускай часткі. Рызыкоўна такі кавалак „гісторыі" аддаваць дзеля касмапалітычнай гандлёвай галерэі (яны ва ўсім свеце аднолькавыя і нудотныя!). Зараз на Юравецкай заараллі зямлю. Цікава, які плён вырасце на гэтым, скажоным рускім духам і фальклорам, грунце?

Ганна КАНДРАЦЮК

Вачыма еўрапейца

Селядцы ці геі?

Не ведаю, што ў іміджы лепшае для прамоцыі Беластока — тое, што асацыюецца ён з селядцом, ці тое, што з гамасексуальнымі мяншынямі. Думаю сабе, што на адным і на другім сталіца Падляшскага ваяводства магла б зрабіць інтарэс, як ужо прабуе прамаваць, выкарыстоўваючы Людвіка Заменгофа. Гэтая дылема нарадзілася ўва мне ў апошнюю суботу, калі я на хвіліну трапіў на першы фестываль селядца ў прыратушным эсперанцкім рэстаране. Некалькі рэстараннікаў паказвала сваё кулінарнае майстэрства, а публіка змагалася ў „следзікаванні". Пасля была папулярна-навуковая сесія, а дырэктар Падляшскага музея Анджэй Ляхоўскі ў студэнцкім інтэрнаце Медыцынскага ўніверсітэта распавядаў аб малавядомых эпізодах з жыцця Беластока ў дакладзе „Селядзец і беластоцкая справа". Яшчэ ў эсперанцкім рэстаране Дарыюш Шада-Бажышкоўскі з беластоцкага тэлебачання, па паходжанні кашуб, гаварыў:

— 122 гады таму маці выслала якраз у гэтае месца Людвіка Заменгофа, каб купіў селядца. Малога Людвіка мучыла дылема: прадаўцы прапаноўвалі селядца на шмат якіх мовах. Гэта яго натхніла на думку стварыць адну мову для ўсіх — эсперанта.

Андрэй Федарук са Згуртавання „Dorzecze", галоўны арганізатар імпрэзы, дзень да гэтага ў эфіры беластоцкага тэлебачання пераконваў, што селядца можна ўспрымаць „у культурным, а нават этнаграфічным кантэксце", хоць мне дагэтуль здавалася, што выключна ў алеі, смятане ці ў цесце. Ды хай там. Можа, фактычна, селядзец мог бы стаць нейкай прыкметай Беластока, якая памагла б нейк вылучыць гэты горад. Таксама як той няшчасны лагатып акцыі „Узыходзячы Беласток", які меў прамаваць Беласток, а нагадваў знак арганізацыі гомасексуалістаў са Злучаных Штатаў. Дзякуючы яму ўся Польшча, а можа і ўвесь свет, загаварылі пра падляшскую сталіцу, называючы яе Гейстокам. Аж хацелася б сказаць: „Няважна, як гаворацца, абы толькі гаварылі!" Адзін кракаўскі багемнік нават напісаў песеньку з прыпевам: gorące logo, gorące logo/ jakże nie kochać go/ nad Dojlidami jak nad Ładogą/ zwiastuje nam ciepły rok / przytuli złych, napalonych napoi/ oziębłym zrobi hot-spot/ a każdy kołtun co się go boi/ jak Jelcyn w odstawku pajdiot.

„Dorzecze" ў час суботняй імпрэзы пачало апытальную акцыю сярод жыхароў. Пытанні датычылі таго, ці гэта якраз селядзец павінен быць прыкметным знакам Беластока:

— Чаму мы мусім задумвацца над лагатыпам „Узыходзячага Беластока", а не вярнуцца да селядца? — здавалася, рытарычна, пытаўся Андрэй Федарук, любіцель кухарскай справы.

Дадаў:

— Не мусім саромецца нашага „следзікавання", так як сілезцы ці кашубы не саромяцца сваіх гаворак.

У час селядцовай імпрэзы зрабілася мне прыкра, бо калі прыняць, што якраз гэтая рыба мела б быць беластоцкай прыкметай, дык чаму арганізатары спаланізавалі яе ці звялі да „крэсаў". Селядзец мог бы прыслужыцца да польска-беларускага міжкультурнага дыялога! Не горшы ён чым зуброўка некалькі месяцаў таму ў час пераломнай сустрэчы міністраў замежных спраў Польшчы і Беларусі — Радаслава Сікорскага і Сяргея Мартынава. Селядзец у беларускай і шырэй усходнеславянскай кулінарнай традыцыі займае такое ж пачэснае месца што і ў польскай ці заходнеславянскай!

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

Брава, Звяз беларускай моладзі!

Тэкст і фота Аляксея МАРОЗА

Звяз беларускай моладзі рашыў выкарыстаць пустуючы і нішчэючы будынак былой падставовай школы ў Шчытах, пазней прызначаны на вясковую святліцу, для беларускай справы. ЗБМ хоча адрамантаваць мураваны будынак і стварыць у ім Цэнтр адукацыі і прамоцыі беларускай культуры. Радныя Арлянскай гміны прынялі пастанову, якая дазваляе войту прадаць для ЗБМ будынак былой школы разам з участкам з 90% скідкай. Звяз летам мінулага года і некалькі гадоў таму ўжо супрацоўнічаў з гміннымі ўладамі ў Орлі, калі ставіў па вёсках Арлянскай гміны стэнды з інфармацыяй аб гісторыі сёл.

У пустуючым і нішчэючым будынку былой Падставовай школы ў Шчытах прадбачваецца адкрыць Цэнтр адукацыі і прамоцыі беларускай культуры

Пераўтварыць пустуючы будынак у цэнтр

— Перш за ўсё хочам выкарыстаць пустуючы будынак для адукацыйных праграм і прамоцыі беларускай культуры. Прадбачваем таксама ў ім вясковую святліцу і мерапрыемствы для жыхароў Арлянскай гміны. Хочам стварыць бібліятэку, інтэрнэт-кафэ, арганізаваць выстаўкі і ладзіць сустрэчы для мясцовага насельніцтва. Памяшканні былой школы прадбачваем выкарыстаць на патрэбы вёскі, гміны і беларусаў з усяе Польшчы, — заяўляе старшыня ЗБМ Міхась Сцепанюк. — Аднак перш за ўсё хочам, каб Шчыты былі месцам сустрэч беларусаў Падляшша. Самі Шчыты — гэта цікавая вёска са славутай гісторыяй. Школьны будынак распаложаны па-суседску са старадаўняй царквой.

— Мы захапіліся месцам, на якім распаложаны нішчэючы будынак. Яно аказала на нас вялікае ўражанне. Рашылі мы прывесці будоўлю і тэрыторыю вакол яе ў парадак ды арганізаваць тут цэнтр. У беларускім асяроддзі не хапае месца, дзе маладыя людзі маглі б сустракацца як у сябе. Зараз маладым людзям няма таксама дзе пастаянна прэзентаваць беларускую культуру, апрача Беларускага музея ў Гайнаўцы, але аднаго месца мала. Наш цэнтр будзе ў галоўным накіраваны на маладое пакаленне, але будуць маглі карыстацца ім і старэйшыя асобы, асабліва, калі гаварыць пра мясцовае насельніцтва, — кажа каардынатар праекта, намеснік старшыні ЗБМ Ігар Лукашук.

Участак пад будынкам з чырвонай цэглы вялікі, больш за гектар. У непасрэдным суседстве няма сельскагаспадарчых будынкаў, пах з якіх мог бы псаваць настрой у час адпачынку. У пазнейшым перыядзе прадбачваецца арганізаванне ў цэнтры летнікаў і іншых сустрэч.

— У першую чаргу прадбачваем рамантаваць першы паверх і выкарыстаць яго на дзейнасць нашага цэнтра. Толькі пазней можна будзе рамантаваць другі паверх і прызначыць яго на начлежную базу, — дабаўляе Міхась Сцепанюк. — Пазней трэба будзе добраўпарадкаваць плошчу вакол будынка.

— Месца, якое мы выбралі на наш цэнтр, распаложанае непадалёк ад шашы Бельск-Падляшскі — Гайнаўка і зручна сюды даехаць як з Бельска і Гайнаўкі, так і з Беластока. Шчыты і навакольныя сёлы кампактна населены беларусамі, а частка нашага цэнтра мае ж быць агульнадаступнай для мясцовага насельніцтва, — кажа член управы ЗБМ Лукаш Плева.

Каб правесці рамонтныя работы і рэалізаваць задуму Звяз беларускай моладзі будзе патрабаваць сродкаў, за якімі выступіў ужо з праектам у Міністэрства ўнутраных спраў і адміністрацыі. У час сесіі, якая праходзіла 12 лютага ў Орлі, радныя прынялі пастанову, якая дазваляе войту прадаць школьны будынак у Шчытах з 90% скідкай. Калі яшчэ раней спецыялісты па нерухомасцях вызначылі цану будынка з участкам на 172 тысячы злотых, атрымліваецца, што звязаўцам прыйдзецца заплаціць за нерухомасць больш за 17 тысяч злотых і справіцца з коштамі здзелкі.

— Мы станоўча ўспрынялі рашэнне радных, якія прыхільна паставіліся да нашай прапановы, — заяўляе старшыня ЗБМ Міхась Сцепанюк. — Спадзяемся, што ў рамках дафінансавання з Міністэрства ўнутраных спраў і адміністрацыі нашага праекта па стварэнні Цэнтра адукацыі і прамоцыі беларускай культуры будзем маглі выдаткаваць грошы на куплю школьнага будынка.

— Вельмі добра, што ў Арлянскай гміне ёсць зразуменне для нашай ініцыятывы, — дабаўляе Ігар Лукашук. — У гэтым годзе прадбачваем зрабіць дакументацыю на рамонт будынка, атрымаць усялякія дазволы і забяспечыць яго, каб не нішчэў.

Падляшскі культурны шлях „Дрэва і сакрум"

Першая частка Падляшскага культурнага шляху „Дрэва і сакрум" праходзіць у вялікай ступені якраз праз Арлянскую гміну, у якой члены і сябры Звязу беларускай моладзі наладзілі летам мінулага года этнаграфічна-гістарычны летнік і адсюль выязджалі таксама ў суседнія гміны збіраць матэрыял з мінулага.

— Ініцыятарамі стварэння Падляшскага культурнага шляху былі чыноўнікі Маршалкоўскай управы ў Беластоку, а мы, як Звяз беларускай моладзі, прыступілі да рэалізацыі гэтага праекта, — заяўляе Лукаш Плева. — Летам мінулага года мы даследавалі тэрыторыю, на якой узнік першы этап гэтага шляху.

Даследча-этнаграфічны летнік, у якім прымалі ўдзел студэнты з Беластока, Торуня, бельскія і гайнаўскія белліцэісты, праходзіў у Орлі.

— Мы летам збіралі этнаграфічны і гістарычны матэрыял аб сёлах, даўніх вырабах з драўніны і даўняй драўлянай сакральнай і свецкай архітэктуры, якія апынуліся на першым этапе шляху „Дрэва і сакрум", што праходзіць праз Бельскую, Арлянскую, Дубіцкую і Чыжоўскую гміны. Папоўнілі мы іх інфармацыямі з гістарычных крыніц і, апрацаваўшы ўвесь матэрыял, змяшчаем яго на стэндах у паасобных вёсках. Знаходзяцца на іх таксама здымкі даўняй драўлянай архітэктуры, найчасцей хат і цэркваў. З гісторыяй, апрача турыстаў, могуць пазнаёміцца таксама жыхары паасобных сёл. На сваім шляху мы пазнаёміліся з мінулым мястэчка Орлі, вёсак Кашалі, Рудуты і Спічкі. Калі гаварыць пра іншыя гміны, дык наведалі мы Парцава, Ракавічы, Збуч, Мора, Карыцкі, Стары Корнін і Дубічы-Царкоўныя, — Лукаш Плева пералічвае мясцовасці, дзе пабывалі звязаўцы і іх сябры. — Распачалі мы рэалізаваць наш праект з тэрыторыі, дзе кампактна жывуць беларусы, але ў будучыні будзем таксама рэалізаваць яго на тэрыторыях, дзе жывуць палякі і іншыя нацыянальныя меншасці.

— Яшчэ з чыноўнікамі Маршалкоўскай управы ў Беластоку разглядаем па якой тэрыторыі працягваць рэалізацыю нашага праекта і магчыма, што праз Чыжоўскую гміну павернем на поўнач, — удакладняе Міхась Сцепанюк.

Наўскос ад будынка былой школы ў Шчытах, побач царквы, пастаўлены звязаўцамі стэнд з інфармацыяй на беларускай, польскай і англійскай мовах

Гмінныя ўлады Орлі дапамагалі звязаўцам у час стаўлення стэндаў з інфармацыяй аб паасобных сёлах, якія з'яўляюцца добрай турыстычнай рэкламай гміны. Супрацоўніцтва з Арлянскай гмінай звязаўцы наладзілі яшчэ ў час стаўлення інфармацыйных стэндаў у рамках „Царскага шляху", які ў некаторых месцах супадае са шляхам „Дрэва і сакрум". Такі стэнд з інфармацыяй аб Шчытах на беларускай, польскай і англійскай мовах стаіць побач даўняй царквы, наўскос ад былога школьнага будынка. Указальнікі з назвамі вёсак на беларускай і польскай мовах, што ставілі звязаўцы ў рамках „Царскага шляху", пэўна таксама сталі станоўчым прыкладам для Арлянскай гміны, якая зараз рашылася ставіць двухмоўныя ўказальнікі пры сваіх мясцовасцях.

Мы яшчэ сустрэнемся

Моладзь з Гімназіі ў Гарадку паехала на вечарыну ў Нарву. Гімназісты сустракаюцца штогод. Раз у Гарадку — раз у Нарве. Такім чынам працягваецца праект „У нас так — а як у Вас?"

Вучняў, настаўнікаў і бацькоў у Нарве прывіталі сардэчна. Усе звярнулі ўвагу, што на сустрэчу прыехалі не толькі вучні і настаўнікі, але і бацькі.

Першымі выступілі госці. Вучні з Гарадка паставілі адну частку мультфільма „Джоаніта". Пасля на гармоніку зайграў гімназіст з Нарвы, а яго сяброўкі паставілі п'есу „Пярэстая красуля". Выступленні ўсім спадабаліся.

Пасля артыстычнай часткі гаспадары абдаравалі ўсіх падарункамі і ўгасцілі смачным пачастункам. Праз некалькі хвілін моладзь гуляла, а старэйшыя ўдзельнікі вечарыны вялі бяседы. Не апошні раз гімназісты сустракаюцца. Гарадок запрасіў ужо сваіх нарваўскіх сяброў і настаўнікаў да сябе ў госці. Маем надзею, што як заўсёды будзе з намі спадар Пётр Касацкі, які ад самага іх пачатку з'яўляецца жывым прадаўжальнікам сустрэч.

Альжбета РАМАНЧУК
настаўніца беларускай мовы ў Гарадку, Залуках і Чаромсе

А звярына гуляе

Прыбывае лясной звярыны ў навакольных лясах. Як гавораць леснікі, гэтаму спрыяюць лагодная зіма і большая пасяўная плошча, на якую заходзяць „чатырохногія". Да нядаўна па кузаўскай вуліцы гулялі зайчыкі, а па полі бегалі курапаткі. Зараз і дзікі сталі забягаць. У наваколлі Чаромхі водзяцца алені, лосі, дзікія козы, рысі, дзікі і ваўкі. Нават на Тэрахах, за Вулькай-Тэрахоўскай, зубр прыжыўся. Навакольныя лясы паспрыялі разводу лясных птушак. Гэтых немагчыма пералічыць. З большых можна вылучыць цецерука, глушца і некалькі відаў ястрабаў. Пагрозай для меншай звярыны з'яўляюцца лясныя драпежнікі і бяздомныя сабакі, якія валэндаюцца па палях і загуменні (мо таму прыкмячаецца менш зайцоў ды курапатак).

Калісьці ў Чаромсе быў паляўнічы Косця, які не даваў промаху катам і сабакам. Страляў кожнага, якога сустрэў па-за забудовамі. Зараз гміна не спраўляецца з праблемай, а бяздомныя сабакі ствараюць пагрозу не толькі для зайцоў ці курапатак, але і для людзей. Страшна ўвечары вуліцай прайсці, бо чарада сабак можа нечакана накінуцца на чалавека.

(ус)

Дубы

Прыгожыя дубы — помнікі прыроды — знаходзяцца ў лясах Белавежскай пушчы. Яны варожаць вока каля Свінароя́ў, Пераходаў, Гнільца, Падбаравіска, Крыніцы і Лазіцаў. Прыгожае дрэва са шляхетнага віду ліставых можна ўбачыць ля дарогі пры чыгуначным вакзале ў Плянце (уверсе ў ім ёсць дупло, у якім водзяцца пчолы) ды каля царквы ў Нараўцы.

Стройныя векавыя дубы растуць у Гайнаўцы па вуліцах Белавежскай, Паркавай, Пілсудскага, 3 Мая і а. Дзевятоўскага. У мінулым годзе з аднаго дуба па вул. 3 Мая віхор скрунуў крону. Цяпер, зімою, ссеклі адзін гайнаўскі дуб у гарадскім парку. А ўлетку было на ім лісце. Ці не паспяшаліся?..

(яц)

З настаўнікамі пра талерантнасць!

— У нас няма неталерантнасці, — кажа Славамір Кулік, настаўнік з Дубіч-Царкоўных. У ягонай школе — вучні многіх веравызнанняў. Заняткі па рэлігіі маюць тут праваслаўныя, каталікі, баптысты, спасапраабражэнцы. Урокі рэлігіі (на бюджэтныя сродкі) адны праводзяць у школе, другія — у сваіх малітоўных дамах.

У Дубіцкай гміне пражываюць вернікі дзевяці веравызнанняў. Нягледзячы на рэлігійную мазаіку, больш за 80 працэнтаў насельніцтва лічыць сябе беларусамі, якім характэрны ген талерантнасці. На ўрокі беларускай мовы прыходзяць дзеткі ўсіх веравызнанняў, многія з іх карыстаюцца мясцовым дыялектам.

Інакш справы маюцца ў недалёкай Гайнаўцы. Нацыянальны падзел тут амаль поўнасцю супадае з рэлігійным: праваслаўны — беларус, каталік — паляк.

— Ад дзесяці гадоў арганізуем мерапрыемства „Ноты сяброўства", — кажа дырэктар Гайнаўскага дома культуры Андрэй Скепка. — Нашы ўдзельнікі — дзеці і моладзь. На сцэне, побач сябе, гучаць польскія, беларускія, украінскія песні. Сярод міжнацыянальных праектаў Андрэй Скепка называе яшчэ „Вясельныя бяседы". Акцёрамі ў іх выступаюць дарослыя прадстаўнікі этнічных і нацыянальных меншасцей. Паказалі ўжо свае вясельныя абрады беларусы, курпы, ромы... Мы пацікавіліся як гайнаўская сцэна ставіцца да самай папулярнай у мешаных грамадскасцях з'явы.

— А ці было сыгранае ў вас ужо вяселле мешанага сужонства?

— Не, яшчэ не было такога! — чуем у адказ.

Дырэктар Гайнаўскага дома культуры адзначае, што найбольш актыўнымі ўдзельнікамі ў яго ўстанове з'яўляюцца беларусы. І, як настаўнік з Дубіч-Царкоўных, не наракае на недахоп талерантнасці.

Фота Ганны КАНДРАЦЮК

З мікрафонам Марыя Шышко з Дэпартамента культуры Маршалкоўскай управы Падляшскага ваяводства

Зразуменне для ідэі талерантнасці найбольшае ў мясцовасцях, дзе пераважную большасць або палову складаюць меншасці. Іх рэальная прысутнасць станоўча ўплывае на працэс фармавання стандартаў. Невыпадкова, міжнацыянальныя праекты найперш пачаліся ў такіх гарадах як Бельск ці Гайнаўка. Беласток, сталіца рэгіёна, толькі што адкрываецца на з'яву.

— Год таму мы ў сваёй школе наладзілі Фестываль меншасцей, — кажа Яўгенія Пятрышык, настаўніца польскай мовы у ПШ № 12 у Беластоку. Мерапрыемства нашым вучням паказалася вельмі патрэбным. Многія з іх упершыню даведаліся пра гурток украінскай мовы, які тут працуе „ў падполлі" ўжо дзесяць гадоў. Напрыканцы красавіка школа запланавала другі выпуск Фестывалю меншасцей (вядома, з прэзентацыяй беларускай культуры, хоць галоўны акцэнт пастаўлены на чачэнцаў, якія вучацца ў ПШ № 12).

Гутаркі пра міжкультурнасць і талерантнасць упершыню былі накіраваны да настаўнікаў і дзеячаў культуры.

— Мы не спадзяваліся такога вялікага зацікаўлення, — кажа Марыя Шышко з Дэпартамента культуры Маршалкоўскай управы Падляшскага ваяводства.

І вельмі мы рады жывому зацікаўленню, абмену думкамі, вопытам, станоўчым прыкладам талерантнасці. Бо школа, як паказалі апытальнікі, мае самы вялікі ўплыў на погляды чалавека.

Канферэнцыя для настаўнікаў праходзіла 10-11 лютага ў Адукацыйным цэнтры для настаўнікаў у Беластоку. Побач дакладаў прапанаваліся паасобныя праекты, публікацыі і мастацкія прэзентацыі, выступленні ў выкананні дзяцей і дарослых. Мерапрыемства праходзіла пад шыльдай Міжкультурнага года дыялога, а фірменны знак мерапрыемства аформіў мастак Лявон Тарасэвіч.

Ганна КАНДРАЦЮК

Фота Аляксандра ВЯРБІЦКАГА

Чырвоная капліца

Калі з Гайнаўкі ездзілі паязды ў бок Семяноўкі, з акон вагонаў паказвалася каля Дубін сакральнае збудаванне з чырвонай цэглы. Цяпер, калі каля Дубін пасажырскія цягнікі не праязджаюць, збудаванне амаль схавалася ад вонкавых вачэй, бо для назіральнікаў з аўтамабіляў, што імчацца па дубінскай вуліцы, яно паказваецца толькі імгненнем.

Гісторыя чырвонай капліцы, пра якую тут гутарка, ператканая — быццам уток з асновай — з гісторыяй тамашняга прыхода, якая — прыхадская гісторыя — даволі таемна замяла за сабой свае раннія сляды. Невядома калі быў заснаваны ў Дубінах самастойны прыход, невядома таксама, калі была там узведзена першая царква. Вядома адно, што да 1872 года драўляная дубінская царква стаяла побач месца, на якім цяпер стаіць згаданая чырвоная капліца. У 1872 годзе тая драўляная царква была прададзена з Дубін у Рагачы, бо ў Дубінах узводзілася новая, мураваная царква. Адно ў рагачоўскай царкве стаяць два іканастасы; паводле маіх інфарматараў цяперашні бакавы рагачоўскі іканастас раней стаяў на цэнтральным месцы ў Дубінах.

У тым жа 1872 годзе была ў Дубінах пасвечана новая царква, мураваная; магчыма, што будавалася яна ў рамках мацавання царскімі ўладамі праваслаўя пасля Студзеньскага паўстання 1863-1864 гг. Царкву тую пабудавалі на іншым месцы, якое выдзеліла тадышняя тамашняя пані; магчыма, што гэтае рашэнне вымусіла зямельная рэформа ў царскай імперыі — вызваленне сялян ад прыгону, значыць скасаванне паншчыны, якое адняло рабочую сілу ад абавязку апрацоўкі панскіх маёнткаў.

У 1898 годзе на даўнім цвінтары тадышні дубінскі бацюшка Парфен Базылеўскі пабудаваў сямейную грабніцу з чырвонай цэглы; гэта менавіта той сакральны будынак, пра які і была згадка. Ранейшы цвінтар надалей аставаўся элементам царкоўнага абраду ў Дубінах. Побач яго праходзіла дарога на тадышнія дубінскія могілкі і тут спыняліся для вывадной малітвы пахавальныя шэсці. Новае збудаванне на свой лад узбуйняла ранг пазбаўленага царквы месца.

Старыя дубінскія могілкі, што каля кіламетра на захад ад вёскі, за чыгуначнай лініяй, былі закрыты ў 1935 годзе; з таго часу пакойнікаў сталі хаваць на новых могілках, што былі закладзены паміж Дубінамі і Навасадамі на колішняй папоўшчыне. Каля старога цвінтара перасталі хадзіць нават пахавальныя шэсці.

Калі ў 1939 годзе насталі саветы, яны павыкідалі ўсё з чырвонай грабніцы, зрабілі там нейкі склад, будынак часткова знішчылі. Пасля вайны грабніца была адбудавана... Нейкіх 30-40 гадоў таму яна яшчэ раз сыграла незвычайную ролю: карысталіся ёю канакрады. Было іх траіх: адзін з Трывежы, адзін са Скупава і адзін мясцовы, з Дубін. Украдзеных уначы коней яны, перад далейшай адпраўкай, на дзень зачынялі ў чырвонай капліцы за вёскай...

На старым, абведзеным каменнай агароджай, цвінтары, побач капліцы, асталося некалькі старых помнікаў, у тым ліку адзін чыгунны на каменным пастаменце яшчэ з 1870 года. У самой капліцы вісіць некалькі іконак. Малітва тут адбываецца раз у год, калі спыняецца шэсце, якое на Провады наведвае старыя дубінскія могілкі. А на месцы колішняй драўлянай царквы, што цяпер у Рагачах, расце маладая бярэзінка.

Аляксандр ВЯРБІЦКІ

Яшчэ пра нядаўні скандал

Аб тым, што праваслаўныя духоўныя былі прымушаны кантактавацца з Установай па справах веравызнаяў, вядома было ўсім. Ніхто гэтага не ўспрымаў як супрацоўніцтва з рэжымам, толькі лічыў цяжкім ярмом, ускладзеным на хрысціянскія касцёлы ўладай бязбожных камуністаў. Некаторыя святары, у тым ліку і епіскапы, атрымлівалі нейкія невялікія грошы ў якасці сімвалічнай заплаты за навучанне рэлігіі ці — радчэй — за капеланства. Напэўна былі і такія, ад якіх патрабаваліся пісьмовыя справаздачы аб замежных паездках ці кантактах з наведваючымі нас замежнікамі. Няраз не былі гэта справаздачы напісаныя духоўнымі, толькі пісьмовыя справаздачы з размоў, саставленыя „ўбекамі" (так называлі ўсіх функцыянераў, падначаленых Міністэрству ўнутраных спраў). І ніхто разумны, ніхто сапраўды дарослы не абвінавачваў і не абвінавачвае нашых пастыраў за гэтага роду прымусовыя кантакты. Падтрымлівалі іх дзеля святога спакою і дзеля аблягчэння, а часам нават стварэння магчымасці царкоўнай дзейнасці на дадзенай тэрыторыі. Маладыя мужчыны, якія сваю будучыню звязвалі з Царквою (семінарысты, студэнты тэалогіі, кялейнікі ці шафёры епіскапаў), выклікаліся ў адпаведныя камендатуры міліцыі ці офісы, дзе іх распытвалі пра розныя справы, напрыклад, што ўладыка спажывае на абед, хто яго наведвае, якімі тэлеперадачамі цікавіцца... Нявопытныя маладзёны станавіліся несвядомымі інфарматарамі спецслужбаў аб розных аспектах царкоўнага жыцця, але іх начальства ведала аб гэтых размовах і не забараняла іх. „Дзеля святога спакою", — гаварылася тады. „Для дабра Царквы", — кажуць цяпер. Але гэта не было даносчыцтва на людзей, гэта не было сакрэтнае і шкоднае для іншых супрацоўніцтва з „органамі".

Каб пайсці на больш цесную сувязь са спецслужбамі, трэба было мець штосьці сур'ёзнае на сумленні (напрыклад, скрываны гомасексуалізм ці растрату большай сумы грошай) або папросту мець душу і характар Іуды. І менавіта такога роду супрацоўніцтва, якое называюць даносчыцтвам, з'яўляецца жахлівай заганай на абліччы духоўнага, выклікае агіду і абурэнне. І тут звычайнага „прабачце" ці ілжывай спасылкі, напрыклад, на „ратаванне Царквы" недастаткова. Маральная агіда ад такога роду ўчынкаў духоўных асоб, якія па сваёй сутнасці павінны служыць іншым, чым зямныя, ідэалам, з'яўляецца не толькі асабліва брыдкай, але і грознай.

Грозная яна перш за ўсё сваёй амаральнасцю. Хтосьці, хто для паскарэння сваёй кар'еры, для атрымання грашавітай пасады ці для задавальнення хворага славалюбства асмеліўся пайсці на такія прадажніцкія ўчынкі, няварты выконваць пастырскія абавязкі. Гэта вынікае з, падобна абавязваючых, канонаў. Чаго ж тады навучыць ён падначаленыя яму душачкі? Якім чынам пераканае іх у сапраўднасці прапаведаваных ім навук?

Гучная апошнім часам справа сакрэтнага супрацоўніцтва са спецслужбамі розных „Юркаў", „Маркаў" ці іншых „Міркаў" узбударажыла праваслаўнае асяроддзе. Звычайных вернікаў, наіўных і даверлівых, гэта шакіравала. Для немалой, на жаль, групы, якая ў мінулым або сама, або цераз сваіх сыноў, мужоў ці братоў мела дачыненне да дзеянняў УБ-СБ, было гэта недапушчальным рассакрэчаннем сямейных тайнаў або аспрэчваннем іх „заслуг". Духавенства апынулася ў дурным становішчы, паколькі частка з іх рабіла тое ж самае, а астатнія ведалі, толькі маўчалі. І маўчалі не толькі ад страху, але сапраўды дзеля дабра Царквы: каб не дражніць усемагутную ўладу, каб не абураць людзей, каб не ставіць сваіх калег з суседніх прыходаў у дурной сітуацыі. Але ў маўчання свая цана, якую менавіта цяпер прыходзіцца плаціць. Рахунак прад'яўлены ў імя праўды і для ачышчэння атмасферы.

Газетныя загалоўкі гучна паведамлялі: „Гульня з бяспекай за жыццё Царквы", „Патрэбны былі кампрамісы, каб выратаваць Царкву"... Дык давайце прыглянемся гэтай гульні, гэтым кампрамісам. Ці ўжо ў 1965 годзе сексот „Юрэк" адыгрываў у царкоўных структурах такую вырашальную ролю, што менавіта ад яго залежала выратаванне жыцця Царквы? Бо епіскапам, ад працы якога сапраўды можа нешта залежаць, стаў нашмат пазней! Але не хачу абапірацца на тое, што напісаў Цэзары Гмыз у газеце „Жэчпасполіта", пачакаю публікацыі Інстытута нацыянальнай памяці, якая мае з'явіцца яшчэ ў гэтым месяцы. Урэшце даведаемся, што сказаў сам герой двух інтэрв'ю, апублікаваных у штодзённках „Gazeta Wyborcza" (3-4.01.2009) і „Rzeczpospolita" (13.01.2009).

Не аспрэчвае ён саміх сустрэч з эсбекамі: „Не помню, можа раз на паўгода, можа часцей". Дзіўнае, бо калі гэта былі сапраўды нямілыя сустрэчы, то бадай помняцца яны доўга. Тым больш, што гэтых сустрэч магчыма было больш, чым 2-3 у год, бо сам прызнаецца, што „не помніць дакладнага ходу столькіх размоў". Змесцівам папкі ў ІНП „Юрэк" не цікавіцца, бо „не будзе корпацца ў смецці". Але калі гэта сапраўды смецце, то якім чынам магло яно ратаваць жыццё Царквы і за што тады ён просіць у нас прабачэння? І робіць гэта з агаворкай: „Калі кагосьці я гэтым абурыў". То можна яшчэ ў нечым сумнявацца? Аб тым, што з'яўляецца ён сакрэтным супрацоўнікам (удумайцеся ў гэтыя словы: супрацоўнік — гэта той, хто разам з некім працуе, а сакрэтны — гэта такі, што робіць у таямніцы перад атачэннем!!!), „зарыентаваўся вельмі хутка". І такі інтэлігентны, хутка зарыентаваны малады чалавек не ведаў аб прыпадках сексуальных адхіленняў у некаторых духоўных, калі ўсім навокал было гэта вядомае і гучна каментаванае? „Адкуль мне ведаць, якія ў каго схільнасці?!" — кажа. Цяжка ў такое паверыць.

Сваім духоўным айцом сексот „Юрэк" называе архіепіскапа Георгія. Здаецца мне, што нямногаму ў яго навучыўся. Уладыка Георгій вядомы быў як праціўнік супрацоўніцтва праваслаўных з камуністамі. І ўладам прыйшлося з гэтым змірыцца. А што па гэтай прычыне не атрымаў ён павышэння? Не для кар'еры служаць Богу ў Ягонай Царкве і толькі дзякуючы ціхай, пакорлівай службе Царква жыве і жыць будзе. Генеральскія і прафесарскія званні Богу непатрэбныя.

Можна гэты пералік нараканняў працягваць, але справа не ў тым, каб рабіць гэта. Усюды, дзе маем дачыненне да людскіх слабасцей — а слабымі на ўсялякія спосабы з'яўляемся мы ўсе — д'ябал хуценька дапамагае ва ўзнікненні розных праблем. Раз большых, іншы раз невялікіх, затое атручваючых кроваварот царкоўнай супольнасці, калі іх своечасова не вырашыць, не ўстараніць. А ўся бяда ў нашай супольнасці заключаецца ў тым, што аб гэтых праблемах не вядзецца размова, няма такога форуму, на які можна было б іх вынесці і вырашыць. І такім чынам розныя бруды збіраюцца, аж урэшце калісьці скула разальецца. А тады рану трэба неадкладна ачысціць ад гною, каб лягчэй зажыла. Замазванне бруду брудам можа не вылечыць, а толькі давесці да гангрэны. А гэтага хіба ніхто з нас не хоча.

(Прозвішча аўтара да ведама рэдакцыі)

Сартуем адходы!

Жыхарам вялікіх гарадоў штораз часцей удаецца пазбегчы аплат за вываз смецця. Аплаты ўвесь час растуць, а гэта неабыякавае для сямейных бюджэтаў. Дастаткова толькі падпісаць з камунальным прадпрыемствам дамову на прыём пасартаваных адходаў. Кожны, хто здае пасартаванае смецце, не плаціць ані за яго вываз, ані за спецыяльныя мяшкі. Жыхарам ставіцца адно патрабаванне: адходы павінны быць пасартаваныя і сухія. Але гэтыя ўмовы не цяжка выканаць. Такім чынам абодва бакі дамовы аб дармовым прыёме адходаў задаволеныя, усім такая здзелка выгадная.

На вёсцы такое сартаванне даецца яшчэ лягчэй, чым у вялікім горадзе, бо на кожным панадворку знойдзецца месца для ўстаноўкі некалькіх мяшкоў, а арганічныя адходы і драўнінны попел выдатна падыходзяць для кампосту. Толькі трэба падштурхнуць войтаў да рэнегацыяцыі дамоў з камунальнымі прадпрыемствамі. У сваім інтарэсе ўсе павінны аказваць ціск на радных і солтысаў, каб прымусілі гмінную адміністрацыю выйсці насустрач гэтай слушнай ініцыятыве. **М. Ц.**

І хто тут кажа праўду?..

Справа доўжыцца некалькі год, практычна ад апошніх самаўрадавых выбараў. Чаромхаўская гмінная ўправа абвінаваціла сужонства настаўнікаў мясцовай гімназіі ў тым, што дзеля фінансавай карысці пасведчылі ў дакументах няпраўду. З 2006 года справай займалася гайнаўская пракуратура. Пасля двух гадоў расследаванне было завершана, але абвінавачанне супраць сужонства не трапіла ў суд. Справу пераняла акруговая пракуратура. Яшчэ год доўжылася яна ў Беластоку. У кастрычніку мінулага года сужонству паставілі закід: пасведчанне ў дакументах няпраўды. Затым справа трапіла ў суд у Бельску-Падляшскім (закід гайнаўскай пракуратуры аб „фінансавай карысці" ў ходзе расследвання беластоцкай пракуратурай не знайшоў апраўдання). 15 снежня мінулага года адбылося першае судовае пасяджэнне, а ў лютым г.г. суд пераслухоўваў чарговых сведкаў (разам каля трыццаці чалавек). **(УС)**

Залатыя пары

Нядаўна ў Гарадской управе ў Міхалове (Беластоцкі павет) адбылося ўрачыстае ўручэнне медалёў „За шматгадовае шлюбнае жыццё", прысвоеных прэзідэнтам РП. Кіраўнічка ЗАГСа Агнешка Анціпюк запрасіла дваццаць пар. Медалі ўручалі бургамістр Міхалова Марк Назарка і старшыня Гарадской рады Мікалай Варона.

Медалі і дыпломы атрымалі м.інш. Пётр і Анна Анхімы, Уладзімір і Зіна Ціванюкі, Яўген і Валянціна Флёрчукі, Вінцэнт і Валянціна Гайдукі, Ян і Люба Каласоўскія, Антон і Надзея Красоўскія, Міраслаў і Марыя Леванеўскія, Анатоль і Галіна Мархелякі, Аляксандр і Вольга Назаркі, Аляксандр і Анна Нос, Кастанцін і Раіса Нос, Юзаф і Зіна Рыбінскія ды Мікалай і Надзея Самойлікі. У сувязі са знамянальнай гадавінай юбіляры атрымалі самыя сардэчныя пажаданні ад улад і сем'яў. Былі вялікія келіхі шампанскага за іх здароўе і яшчэ доўгія гады жыцця. **(яц)**

Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

зорка

для дзяцей і моладзі

Народнае і заадно моднае

Народныя традыцыі і строі вельмі часта асацыююцца з музеямі, фестывалямі народных песень, якія не заўсёды цікавяць наймалодшых. Доказам гэтаму, што не мусіць так быць, быў паказ моды „Раз па-народнаму!", які адбыўся 17 лютага падчас бацькоўскай сустрэчы ў бельскай „тройцы".

— Сённяшні паказ завяршае праект „У бабуліным куфры. Сямейныя сустрэчы з традыцыяй", які рэалізвалі мы ад чэрвеня да снежня мінулага года, — патлумачыла мне перад паказам Аліна Дэмбоўская — загадчыца Музея „Ратуша" ў Бельску-Падляшскім.

Праект „У бабуліным куфры" накіраваны быў да вучняў I-III класаў бельскіх школ, а таксама да іхніх бацькоў і дзядоў. Галоўнай мэтай праекта было паказаць наймалодшым элементы народнай культуры шляхам кантактаў з народнымі творцамі. На заняткі дзеці прыходзілі разам з бацькамі і дзядамі. Супольна выконвалі яны ўсе працы.

— Ва ўсіх нашых сустрэчах прыняло ўдзел больш за дзве тысячы асоб. Заняткі датычылі, між іншым, ткацтва, гафту, валення ці вырабу калядных аздобаў, — дадала Аліна Дэмбоўская. Паводле яе, адным з найбольшых дасягненняў быў актыўны ўдзел у занятках бацькоў і дзядоў. Такім чынам у нейкі спосаб адновіўся кантакт паміж пакаленнямі. Бабулі ды дзядулі маглі паказаць сваім унукам тое, чым займаліся ў маладосці.

На сцэне дзеці выступалі разам з бацькамі

Кантакт ці супрацоўніцтва паміж пакаленнямі асабліва былі бачны падчас паказу моды. Апрача дзяцей, у якасці мадэляў выступілі таксама бацькі.

Усе мадэлі былі апрануты ў копіі народных строяў характэрных Бельскай зямлі. Запрэзентавалі яны жаночую і мужчынскую вопратку на цёплыя і халодныя дні. Пра ўсе элементы строяў ды спосаб іх выканання дэталёва расказвалі вядучыя паказ.

— Аднойчы дачка папрасіла мяне прыняць удзел у паказе моды, у якім будзем выступаць у народных строях, — сказаў мне Яраслаў Артэмюк, адзіны прадстаўнік мужчынскага полу з ліку бацькоў, якія прынялі ўдзел у паказе моды. На сцэне выступіў ён разам з дачкой Вікторыяй. — Ідэя паказу вельмі мне падабаецца, а з выступам на сцэне, хіба, не было ў мяне праблемаў, бо калісь займаўся ў народным ансамблі, — дадаў ён.

Супрацоўніцтва Бельскага музея і Комплексу школ з дадатковым навучаннем беларускай мовы працягваецца ўжо некалькі гадоў. Вучні вельмі ахвотна прымаюць удзел у занятках, сустрэчах, паказах звязаных з гісторыяй ці традыцыяй. Варта падкрэсліць, што сярод удзельнікаў праекта „У бабуліным куфры. Сямейныя сустрэчы з традыцыяй" найбольш было якраз вучняў „тройкі".

— Варта было б адведаць з нашым паказам іншыя школы ці нават гміны, — сказала пра магчымасці прадаўжання ідэі паказу моды Аліна Дэмбоўская.

Фактычна, добра было б, каб таксама вучні з іншых мясцовасцей пабачылі паказ моды „Раз па-народнаму". У Бельску ўжо ведаюць, што народнае можа быць моднае. Можа надышоў час, каб пра гэтае даведаліся таксама іншыя?

Тэкст і фота Міхася СЦЕПАНЮКА

Адкуль выплывае рака Нарва?

У адзін ліпеньскі дзень паехала я ў Нарву, каб зведаць Курашоўскую гару. З гэтага месца пачынаецца гісторыя мястэчка. Паводле легенды, адсюль бярэ пачатак рака Нарва (спакойная вада). Мяне сюды заклікала легенда:

Даўно-даўно на Курашоўскай гары стаяў белы замак. Княжацкі двор напамінаў светлую паляну сярод векавой дубровы. Паміж людзьмі і прыродай існавала вялікая залежнасць. Той, хто пераняў сакрэты прыроды, мог абярнуцца ў любую птушку, ваўка, дрэва. У замку жыла княгіня Нарва. Княжая дачка замест займацца музыкай і танцамі, увесь дзень праводзіла ў лесе. Яна выседжвала на дубе і назірала за рухам падарожнікаў, якія набліжаліся ў бок іх замка. Адны ехалі ад Кракава, другія — ад Вільні, прывозячы на двор навіны, біжутэрыю, посуд з усяго свету. Аднойчы ў замак з'явіўся ваяр-чужаземец. Ён падарыў князю збан з блакітным арнаментам. Гэтую пасудзіну адразу спадабала Нарва. Княгіня загадала служкам падаваць ёй пітво толькі з гэтай пасудзіны. У адзін спякотны дзень як заўсёды яна сядзела на дубе і сачыла за рухам на гасцінцы. Ёй захацелася піць. За некалькі хвілін з'явіўся і служка з вадой у дараванай пасудзіне. Нарва не заспакоіла смагі; яна ўпусціла збан на зямлю. На дне пасудзіны знаходзіўся сярэбраны вуж. Паводле легенды, вуж даў пачатак рацэ, якую ў гонар княгіні назвалі Нарвай.

Кожны, хто ступіць на Курашоўскую гару, адразу захоча вандраваць у вярхоўі ракі, да сапраўдных яе крыніц. Пасля гадоў мне пашанцавала пабываць на беларускім баку Белавежскай пушчы. Якраз там, ва ўрочышчы Арловы балоты бярэ пачатак рака Нарва. Сапраўды яна напамінае вужаку, якая зігзагам прадзіраецца праз дрыгву і балоты.

Урочышча Арловае балота — важны пункт у прыродзе. Тут знаходзіўся стары пераход, па якім ад Гродзенскай і Белавежскай пушчы перабягала звярына. Ахоўнікамі месца, як кажа сама назва, з'яўляліся каралеўскія птахі — арлы!

І яшчэ адна цікавінка. Паводле легенды, Нарва (ціхая рака) — самая шляхетная сярод нашых рэчак і ручаёў. У яе водах, як пісаў этнолаг і падарожнік Зыгмут Глогер, не сустракаліся гадзюкі.

ЗОРКА

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Міра ЛУКША

Індык з Індуры

Індык з Індуры
непануры з натуры,
сабе індычку-пару
прыехаць шукаць пад Нарву,
быццам цяпер з-пад Гродна
жонку браць ужо нямодна!
Індык фрак індыга надзеў,
у аўтобус у Індуры сеў,
а з Гродна — у Беласток
(цягнула яго вось у гэты бок).
З Беластока — у Бандары,
у Мацейкавай бок Гары.
Пешшу ў Слабодку, і ўміг
у вёсцы быў гэты індык.
Счырванелі індычкі ўсе,
убачыўшы, як па расе
ў смокінгу сінім такім
кавалер, нетутэйшы зусім,
брыдзе — такі ягамосць,
замежны багаты госць!
Іміджам даў па вачах!
І ў прымы ў нашых баках
застаўся індурскі птах.
У Мацейкавай будзеш Гары —
падарункаў ім набяры
(караляў і грабянёў).
Пагасцюеш у індыкоў!

Зося з першага „а” класа

— 19 —

Які настаўнік рыхтаваў самыя цяжкія кантрольныя? Вядома — спадар Іванюк. Гісторык вельмі надакучыў вучням цяжкімі пытаннямі і яны не надта яго любілі. Апошнім часам ён знайшоў яшчэ больш „дакучлівы” занятак. Іванюк пільнаваў ліцэістаў, каб тыя мянялі абутак. З гэтай прычыны ён стаў сапраўдным ворагам вучняў. Зося не часта мяняла чаравікі, таму што Іванюк не адрозніваў жаночага абутку і кожныя туфлі ці басаножкі здаваліся яму тапачкамі. Затое хлопцы дзень у дзень пераабуваліся ў кеды, бо настаўнік гісторыі прыдумваў суровыя кары тым, хто не хацеў яго слухаць.

Аднойчы, калі Пеця не памяняў ботаў, Іванюк пайшоў з хлопцам да выхавацеля. Аднак Янка Рыбачук не палічыў справу сур’ёзнай і пачаў нават смяяцца пад носам са штучнай праблемы. Але Пеця ўз’еўся. Ён прыдумаў жарт, каб такім чынам адплаціць за бессэнсоўны інцыдэнт. Ён запрасіў на ўрок гісторыі свайго сваяка Якуба, які быў ужо студэнтам юрыдычнага факультэта. Хлопцы селі за адну парту, у канцы залы. Настаўнік зусім не прыкмеціў, што ў класе з’явіўся новы вучань. Калі Іванюк стаў расказваць пра „Аповесць мінулых гадоў” Нестара, Якуб узяў голас. Хлапец добра ведаў гісторыю і не пагаджаўся з многімі сцвярджэннямі настаўніка.

— Адкуль у першым „а” такі разумны вучань? — здзівіўся Іванюк.

— Я прыйшоў з іншага ліцэя! — адказаў Якуб.

— Я не бачу ў дзённіку новага прозвішча, — сказаў настаўнік. — Ваш выхавацель пра нішто не дбае!

— Не, вы крышку памыляецеся, — збянтэжыўся Якуб. — Я атрымаў дазвол дырэктара, каб пабываць на ўроку ў вашым ліцэі. Калі мне спадабаецца, я прыйду ў вашу школу.

— Так?! — абурыўся Іванюк. — Тады пайшлі да дырэктара і разам дамовімся як мае быць...

Калі Іванюк выйшаў з залы, Якуб хуценька схаваўся ў прыбіральні.

— Дзе новы вучань? — спытаў Іванюк, вярнуўшыся ў клас разам з дырэктарам.

— У нашым класе няма ніякага новага вучня, — адказалі згодна ўсе вучні.

Дырэктар Баршчэўскі вельмі ўсхваляваўся. За кару, што Іванюк множыць непатрэбныя праблемы, адабраў яму яго любімы занятак — правяранне чаравікаў.

Пасля ўся школа дзякавала Пецю.

— Лепш падзякуйце будучаму юрысту, — адказаў Пеця і пайшоў у прыбіральню.

Тэкст: wodorotlenek92@wp.pl
Дызайн: majeszkarowu@tlen.pl

Музыка з кайфам

Рэп — чалавеку чалавек!

Шмат месца ў апошнім часе прысвяцілі мы поп-музыцы. Цяпер пакінем збоку ўсе Еўрабачанні і перанясемся між жылыя карпусы, бо там, прынамсі паводле расказаў, нараджаўся рэп ці гіп-гоп. Вядома, маю на думцы нашы польскія ці беларускія блокі, бо першыя рэперы рэпавалі да рытмічных бітаў у нью-йорскім Бронксе. Рэпавалі, значыцца дэкламавалі рытмічна, гаварылі так, каб паўсталі рыфмы, якія супадаюць з бітам. Часам у рэпе сустракаюцца меладычныя фрагменты, дзявочыя галасы, гэтак званыя прыпевы. Меладычнасць вельмі характэрная якраз беларускім рэперам ці гіпгапоўцам.

Самым вядомым, асабліва на польска-беларускім памежжы, здаецца быць МС Кроў ці як яго называюць іншыя — Амбасадар Кроў, заснавальнік супольнага праекта беларускіх МС „Чырвоным па белым”. Зараз Кроў рыхтуе свой сольны альбом, які павінен паявіцца ўжо на восені. З-за працы над альбомам і недахопу свежага матэрыялу Кроў зараз не выступае, але пэўна трэба чакаць вельмі добрага альбома, бо канкурэнцыі шмат, а і творчы ўзровень павышаецца. Самае цікавае, Кроў наогул працуе з DJ Spox, які стварае біты і сэмплі для польскага гурту „Masala Soundsystem”, які інспіруецца музыкай Блізкага Усходу. Сваю працу над альбомам завяршыў затое Vinsent. Свет пабачыў яго „Пачатак”, у якім рэпер распавядае шматлікія кранальныя гісторыі пра жыццё. Трэці герой гэта Пан Жыжма. Цікавы гэта творца, можна сказаць народны рэпер, бо сваёй творчасцю мае намер прыблізіць сучаснай моладзі беларускую культуру (жадаем поспехаў!), да таго карыстаецца народнымі інструментамі. Сама назва ўзялася з легендаў Лідскай зямлі і ўжо гэта спрыяе адчуванню, што гэта „наш чалавек”.

Думаю, што ў будучыні больш месца прысвячу паасобным выканаўцам, але ўжо сёння варта ведаць, што адбываецца ў нашых радзімых блокерсаў музыкі.

i_basovka@o2.pl

Вершы Віктара Шведа

Саламон-многажон

Дапытлівы Лявон
Даведаўся аднекуль:
Калісьці Саламон
Быў мудрым чалавекам.

Матуля кажа: — Жон
Меў Саламон плеяду.
Ад іх меў заўжды ён
Каштоўныя парады.

Гасцей выводзяць за парог

— Тата, я маю засцярог
Многа, — сказаў Валодзя.
Чаму выводзяць за парог
Гасцей, што ўжо выходзяць?

Тата сказаў: — Вядуць туды,
Мо каб пераканацца,
Што госці выйшлі сапраўды,
Не думаюць вяртацца.

Польска-беларуская крыжаванка № 9

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы, з наклееным кантрольным талонам, на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку”. Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку № 5:

Імя, слава, від, мятла, тамат, абшар, арка. Кран, мёд, свята, літара, Адам, палатка.

Узнагароды, кніжкі **„Як выскочыв воробіей”** (дзіцячы фальклор на падляшскай мове) выйгралі **Юстына Вакулюк і Крыстыян Грушэўскі** з Арэшкава, **Эвеліна Артэмюк і Адрыян Артэмюк** з Чыжоў, **Габрысь Кузьмін** з Бельска-Падляшскага. Віншуем!

Узнагароды падарыў нам Музей малой айчыны ў Студзіводах.



Тэкст і фота
Аляксандра ВЯРБІЦКАГА

Край шэнгенскай мяжы

Падарожжа поездам здаецца быць лепшым метадам назірання за навакольным светам, чым падарожжа самалётам або аўтобусам. Бо тут можна і праз акно разглянуцца, і прайсціся, і разгаварыцца, і самому падслухаць чужое. Вось у Гайнаўку прыехаў ранішні „рэйкабус” з Чаромхі, які зараз пакалесіць назад. Бо Гайнаўка, з якой калісь раз'язджаліся цягнікі ў розных напрамках, цяпер згарнулася адно да ролі канцавога прыпынку на адной лініі — такога, якім калісь была, напрыклад, Цісоўка. А лініі тыя разыходзяцца зараз ужо з Чаромхі...

Вось адна з пасажырак разважае на тэму курэння на перонах станцыі, якое — забаронена. І на стражы гэтай забароны павінны стаяць службоўцы-сакісты. А яны што робяць? А то ж яны менавіта і кураць на тым забароненым месцы. Гэта можа з фармальнага пункту гледжання і парадокс, але калі бліжэй зазірнуць у абставіны, дык гэта пакажацца нават лагічнай неабходнасцю. Бо што ж тыя стражы парадку маюць рабіць, ездзячы поездам з Чаромхі ў Гайнаўку і назад? То ж яны, бедныя, мучацца, седзячы бяздзейна паўгадзінамі ў тым „рэйкабусе”. І вось у перапынках паміж тымі паўгадзінамі яны і выходзяць распрастаць косці, дыхнуць свежым паветрам, уперамежку са свежым нікацінам. Мог бы хто здзівіцца, навошта такія работнікі... А хто тады будзе ахоўваць нашы „рэйкабусы”, якіх тут асталося ўжо менш чым зуброў? (Мо нават і пасажыраў менш чым зуброў.) І куды ж дзенуцца тыя стражы-грузы: мо пойдуць поле араць?..

Нашу чыгунку трэба берагчы хіба не менш чым нашу запаведную пушчу. Бо чыгункі ў нас усё менш і менш, так як калісь было ўсё менш і менш туроў ці зуброў. Вось на прыпынку ў Арэшкаве вітаюць пасажыраў развалiны чыгуначнага будынка, які яшчэ паўтара года таму разглядаў я і нават апісаў яго нашым чытачам. У кандуктара, якіх у гэтым мікрапоездзе аж двух — столькі ж як і сакістаў, пытаюся што там здарылася. У адказ чую, што будынак згарэў, а тое, што асталося, расцягнулі людзі. А згарэў ён цалкам нядаўненька, акурат пад Новы год...

Чаромха з'яўляецца зараз прыстанішчам для састарэлых лакаматываў і вагонаў, свайго роду пахавальняй іх. Вось і тут двойка народу — столькі ж як сакістаў ці кандуктараў у „рэйкабусе” цяпер ці партрэтаў вялікіх правадыроў у кожным школьным класе калісь — з паяльнікамі ў руках утылізуюць састарэлыя вагоны для пераплаўкі. І так мне, разгледзеўшыся па навакольным свеце, здаецца, што чым больш тае распаяльнае работы будзе за імі, тым больш вагонаў для распайвання будзе перад імі — чарговы парадокс, з жанру казачных, як з галовамі ў казачнага змея...

Першае разгалінаванне вуліц у Чаромсе прыемна мяне задзіўляе, бо гэта і разгалінаванне турмаршрутаў. А не спадзяваўся я Чаромхі на турысцкім прыцэле, бо гэта ж не Фларэнцыя ці Маракеш. Не была яна сталіцай вяльможных паноў, якія б тут маглі пабудаваць духазаймальныя палацы дызайніраваныя архітэктурнымі славутасцямі. Была затое Чаромха сталіцай чыгуначнікаў, якія па меры магчымасцей таксама здзяйснялі свае будаўнічыя мары — некаторыя толькі сабе, іншыя сабе і сваім прыгонным: коням і іншым тварэнням Дня пятага і Дня шостага. Дапытлівы турыст можа ў Чаромсе панаглядацца за ўсімі мясцовымі дойлідскімі плынямі і модамі, без снабісцкай аглядкі на Таледа ці Антверпію.

Турінфармацыя ў Чаромсе

Вулька-Тэрахоўская распаложаная недалёка Чаромхі і гэтая, у прынцыпе тапаграфічная, характарыстыка вёскі акрэслівае і яе цэласны характар. Бо чым жа маглі займацца жыхары Вулькі-Тэрахоўскай, жывучы ў двух кіламетрах ад вялікага калісь чыгуначнага вузла? Вялікага выбару то хіба ў іх не было... І сённяшні выгляд вёскі здаецца гэта даказваць.

Вялікатаварных гаспадарак у Вульцы-Тэрахоўскай не відаць. На панадворку край найбуйнейшай у вёсцы мураванкі стаіць хлеў з радочкам дзвярэй, быццам клавішаў у гармоніку. Быў там можа калісь і дзесятак дабытку, але ў наш новы час такі хлеў з'яўляецца ўжо толькі помнікам даўніны. Больш-менш насупраць гэтага панадворка засаджаны свежанькай пасадкай вясковы агарод!..

Пасярэдзіне Вулькі-Тэрахоўскай і яе грамадскі цэнтр, два будынкі: крама і святліца. Наконт святліцы не магу выказвацца, бо пра яе з нікім я не гаварыў, а праз фіранкі ў вокнах амаль не відаць інтэр'еру. Перад ёй дошка аб'яў, на адмысловых „хадулях”, з пустым зместам. А пра будынак крамы то і не трэба нікога пытацца: як на далоні відаць, што гэта сапраўдная нерухомасць — рух тут спыніўся „многая лета” да нашага часу.

Жылыя дамы тут розныя, ёсць населеныя, а ёсць і пустуючыя, напрыклад, сумная цагляная мураванка адзінока пакінутая пасярэдзіне абшырнаватага пляца. Мабыць, яе насельнік перабраўся ў нейкага сорту лепшы свет. І на канцы, бадай ужо за рысай вёскі, неабгароджаны панадворак, з некалькімі вуллямі, з падшытай ветрам клуняй, і з хлявом, адзін дзвярны праём якога загароджаны нейкай брамай, а другі „зачынены” традыцыйным у нас кастром...

Тут бярозы (польскія) і сосны (беларускія) / пагранічнікаў сёстры / тут шумлівы наш лес малады — „шэнгенская” дзяржаўная мяжа

Дарога за Вулькай-Тэрахоўскай цяпер у стадыі інтэнсіўнага фарміравання свайго насцілу. Тут у гразісты час пішацца гісторыя, тут кожная каляіна і кожны абутак пакідаюць свае рэльефныя сляды; у марозны час гэты працэс замарожваецца. Вакол Вулькі-Тэрахоўскай некаторыя палі абрабляюцца, магчыма, што адно толькі па ментальнай інерцыі. За імі лес гадоў сарака, які ўжо — як раней згадвалася — мае ў адным з вясковых агародаў свой плацдарм, і быццам рыхтуецца да чарговага наступлення...

Каля расхадных дарог у лесе згодна пахіліліся два драўляныя крыжы разам з такой жа агароджай. Разам з імі і лампадка, якая яшчэ не страціла свайго бляску — відаць, што яшчэ нехта прыходзіць туды з малітвай.

У лесе, ад паўднёвага боку, з боку граніцы, чуваць гул мотапілы. Мая здагадка, што гэта рэха працы беларускіх дрывасекаў, неўзабаве развеялася, калі я пабачыў каляіны, а пасля і пакінуўшыя іх нашы, значыць з польскага боку, цяглавыя машыны.

І неўзабаве перада мной лясная дарога святлее, паказваюцца гранічныя слупы — выходжу на „шэнгенскую” мяжу. Гэта расчышчаная ад расліннасці паласа шырынёй у нейкіх пятнаццаць метраў, з зааранным загонам пасярэдзіне і слядамі машыны побач яго. Упрытык да гранічнай паласы і паласа „маёй” дарогі; гэтыя паясы аддзелены ад сябе агароджай з адной або дзвюма ніткамі „пажылога” калючага дроту, прычэпленага на невысокіх калочках. Можна было б падумаць, што хопіць шмыгануць цераз такую занядбаную агароджу і без таможных і паспартна-візавых валакіт апынуцца ў іншым свеце... Бо ж, праўду кажучы, я, праходзячы ўздоўж той мяжы, увесь час душою і вачыма быў на другім яе баку. І пабачыў такі феномен, якога ў Польшчы бачыць мне дагэтуль не ўдалося: гэта два вялікія бярозавыя кусты...

Але чысценькі ад расліннасці пояс дзяржаўнай польска-беларускай граніцы ляжыць у практычна глухім з абодвух бакоў лесе. І калі з польскага боку наяўная толькі такая, aby Polska nie zginęła, агароджа, то з беларускага боку, мо за дваццаціметровай сцяной лесу, прасвечваюцца салідныя слупы. Не меў я магчымасці бліжэй прыгледзецца, што на тых слупах, але ж яны ў прынцыпе стаўляюцца толькі на тое, каб прымацаваць да іх непраходную металічную сетку. Дадам яшчэ, што на спадарожнікавых здымках відаць салідную дарогу ўздоўж граніцы з беларускага боку, якая на месцы з польскага боку наогул нябачная.

Дзеля чаго такія бетонныя слупы для шчыльнай агароджы, я магу толькі здагадвацца. Апошнім часам дачытаўся я ў сеціве, што калісь Ленін, задумаўшыся над прыдуманай сабою будучынёй, стаў пабойвацца, што пасля перамогі пралетарыяту ў адной дзяржаве увесь сусветны працоўны люд стане масава ў тую дзяржаву ўцякаць ад сваіх эксплуататарскіх класаў... Але можа быць і іншая прычына: тут жа калісь было дайшло да несанкцыянаванага маскоўскімі панамі трансгранічнага мітынгу шчырай, несанкцыянаванай дружбы мясцовых мужыкоў, і — каб у будучыні, з-за неабачлівых слабасцей пагранічнага персаналу такое не паўтаралася... Маглі б жа паставіць там „заградотряд” з усімі табельнымі прыналежнасцямі, маглі б паставіць іншых цівуноў з дубінкамі. Аднак гэтую нямкую праблему можна было вырашыць і гуманным чынам — абгарадзіўшы людзей сеткай ці калючым дротам...

Гэтая мяжа, устаноўленая 65 гадоў таму, разрэзала не толькі грамадскую тэрыторыю, але і брутальна разрэзала многія жывыя чалавечыя душы. Не было тут калісь лесу, была тут адзіная грамадская супольнасць з некалькіх вёсак, якая гуртавалася — мяркую — вакол прыхадскіх Вярховіч ці Амельянца. Цяпер тая тэрыторыя зарастае лесам, так як і зарастаюць раны на пакалечаных людскіх душах.

(працяг будзе)

Аб бельскай УБ

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

Ад пяцідзесяці да сямідзесяці працэнтаў функцыянераў Установы публічнай бяспекі ў 1944-1956 гадах у Бельску-Падляшскім складалі беларусы. Таксама іх ахвярамі былі дзесяткі тысяч, а саміх функцыянераў УБ з Бельска ў той перыяд загінула дзевяцёх. Так у падляшскай ваяводскай „Ксёнжніцы" сказаў Тамаш Данілецкі, гісторык Беластокага аддзела Інстытута нацыянальнай памяці (ІНП) у час прамоцыі першай з цыкла кніг, прысвечаных апарату бяспекі ў паўночна-ўсходняй Польшчы пры канцы вайны і ў першыя пасляваенныя гады.

— Да гэтага часу нашы веды аб звычайных функцыянерах гэтай зларадной установы былі малыя. Якраз яны часта ганебна няволілі жыхароў нашага рэгіёна, — гаварыў у час прамоцыі публікацыі ІНП Цэзары Кукля, шэф Беластоцкага аддзела Інстытута. — Гэтая кніжка паказвае чым была УБ у глыбінцы, якая была мараль функцыянераў, адкуль яны былі родам.

На тым — як гаварыў дырэктар Кукля — каб якраз кніга як найхутчэй паказалася залежала самому старшыні ІНП Янушу Куртыку. Даследчыцкія працы па яе выданні пачаліся на пераломе 2002 і 2003 гадоў.

— Мы на пачатак выбралі Бельск-Падляшскі, бо гэта быў у той час найбольшы павет у Польшчы, вельмі разнастайны ў нацыянальным і канфесійным плане, ды адначасна па гэтых прыкметах сканфліктаваны, палітычна пераламаны. Адначасна, калі мы прыступалі да апрацоўкі гэтай публікацыі, паявіліся, аднак, аргументы, што па прычыне нетыповасці Бельскага павета не можа ён быць рэпрэзентатыўным і не ўдасца яго, з навуковага пункту гледжання, параўноўваць з іншымі, — тлумачыў, разам з гісторыкам Марцінам Звольскім, Тамаш Данілецкі, аўтары кнігі „Установа публічнай бяспекі ў Бельску-Падляшскім" („Urząd Bezpieczeństwa Publicznego w Bielsku Podlaskim").

Кніга складаецца з дзвюх частак. У першай — апісальнай — аўтары пішуць аб кадрах, арганізацыі, структуры і задачах бельскай УБ, аб змаганні са збройнай канспірацыяй, вылучаючы тут паасобныя этапы паміж вераснем 1944 г. і ліпенем 1949 г., дайшоўшы аж да 1956 года. Вельмі цікавым з'яўляецца раздзел аб метадах дзеянняў, таксама следчых. Тут можна знайсці „модны" ў апошні час матыў супрацоўніцтва і сочкі за духавенствам, таксама праваслаўным. „У першыя пасляваенныя гады УБ шукала сярод праваслаўных духоўных перш за ўсё „нямецкіх супрацоўнікаў", значыць, членаў Беларускага камітэта. Апошніх духоўных гэтага веравызнання УБ лічыла лаяльнымі грамадзянамі, якія „не ўключаліся" ў палітычныя справы. У 1946 г. першаіерарх Праваслаўнай царквы ў Польшчы Дыянісій заклікаў вернікаў да ўдзелу ў рэферэндуме і аддання галасоў на „тры разы так". Перад выбарамі 1947 г. у рапартах бельскай УБ зафіксавана, што праваслаўны духоўнік з Новага Беразова (Гайнаўская гміна) прадказваў, што закліча сваіх прыхаджан, каб прагаласавалі за цяперашнім Урадам і 19 студзеня 1947 г. пойдзе на чале ўсяе парафіі і аддасць свой голас на Дэмакратычны блок. Таксама ў пазнейшы перыяд праваслаўныя духоўныя прадстаўлялі лаяльныя пазіцыі", — фіксуюць гісторыкі ІНП.



Тут прыгадваюць аднаго з бацюшкоў, які „выказаў памяркоўную пазіцыю" да новага дэкрэта аб згуртаваннях. Сярод іх пералічваюць а. Яўгена Панько з Жэрчыч. І дадаюць: „Мабыць, такога роду выпадкі схільвалі УБ да сочкі таксама за гэтым асяроддзем". Зараз пасля ўспамінаюць: „Большыя праблемы ўчынялі функцыянерам УБ праваслаўныя вернікі. Напрыклад, восенню 1951 г. адзін з жыхароў Градалёў самавольна ўзвёў у полі ля студні з „цудадзейнай" вадой крыж. Калі іншыя жыхары паставілі там неўзабаве каплічку, а мясцовы духоўнік пасвяціў гэтае месца, умяшалася УБ, арыштоўваючы трох злачынцаў. У сваю чаргу на пачатку красавіка 1953 г. функцыянеры бельскай УБ зафіксавалі „масавую адсутнасць, нічым неабгрунтаваную, у сямі працоўных установах павета — 105 працаўнікоў. Аказалася, што, — як чытаем у рапарце УБ, — дзень 7 красавіка 1953 г. насельніцтвам беларускай нацыянальнасці лічыцца велікодным святам". Удалося гэта вызначыць, дзякуючы расследаванню „адміністрацыйнымі фактарамі".

Другую частку кнігі складаюць дадаткі: інфармацыя аб функцыянерах бельскай УБ (агулам з кіраўнічым саставам пералічана іх у кнізе больш за 100 прозвішчаў), фрагменты разнародных дакументаў, абшырная бібліяграфія, індэксы прозвішчаў і мясцовасцей, фотаздымкі.

— Функцыянеры, якія дэкларавалі беларускую нацыянальнасць, былі працаўнікамі бельскай УБ ніжэйшага ўзроўню. Былі яны малаадукаваныя, кепска гаварылі па-польску і ў сваім асяроддзі былі вядомыя. Кіраўніцтва складалі найчасцей палякі, таксама з іншых рэгіёнаў Польшчы. Быў гэта такі від палітыкі, які служыў таксама паглыбленню мясцовых падзелаў, — расказваў у час прамоцыі ў „Ксёнжніцы" Тамаш Данілецкі.

У біяграмы функцыянераў уключаны не толькі сухія інфармацыі, але і ў шмат якіх выпадках можна вычытаць, якімі метадамі яны кіраваліся і якая была іх матывіроўка ўладкавацца на працу ў УБ, — дадаў Марцін Звольскі. — Да канца галоўным заданнем бельскай УБ было змаганне са збройнай канспірацыяй. Тое, што адбывалася ў Бельску-Падляшскім, было асаблівым. Практычна кожная асоба, якая сведчыла перад судом у справах супраць функцыянераў, гаварыла, што яе яны білі.

Funkcjonariusze bielskiego UB przed siedzibą Urzędu (ze zbiorów AIPN Bi)

У публікацыях можна вычытаць, што ў сядзібе УБ у Бельску-Падляшскім, значыць, у былым пасляпрмелітанскім кляштары, даходзіла да катаванняў (м.інш. раздаўлялі пальцы, білі тронкамі лапаты, улівалі бензін у нос, зачынялі ў хлебнай печы), урэшце таксама да забойстваў; целы хавалі пад муром і ў Піліцкім лесе. Большасці „герояў" кніжкі няма ўжо ў жывых.

— Што з тымі функцыянерамі, што яшчэ жывуць, цяжка сказаць. У некаторых выпадках ІНП вядзе следства. Клопат у тым, што не хочуць яны з працаўнікамі ІНП гаварыць, хіба што выклікаюць іх нашы пракуроры. На слова „гісторыя" акдладваюць трубку тэлефона або зачыняюць з трэскам дзверы. Перад пракурорамі засланяюцца няпамяццю, — адказваў на адно з пастаўленых пытанняў Марцін Звольскі.

Выстава „Мастацтва супраць дыктатуры" ў Вашынгтоне

12 лютага 2009 г. у штаб-кватэры German Marshall Fund of the United States адкрылася выстава беларускіх мастакоў „Мастацтва супраць дыктатуры", а таксама адбылася дыскусія на тэму сітуацыі ў Беларусі з удзелам прадстаўнікоў беларускай дыяспары, дзеячаў культуры, прадстаўнікоў дыпламатычных місій, акрэдытаваных у Вашынгтоне, дзяржаўных структур і няўрадавых арганізацый ЗША.

Падчас дыскусіі ўдзельнікі абмяняліся меркаваннямі адносна сітуацыі ў Беларусі. Абмяркоўваліся апошнія змены, так званая „лібералізацыя", палітыка Еўрасаюза ў дачыненні Беларусі, а таксама тое, якой павінна быць беларуская палітыка ЗША пры новай адміністрацыі ў Белым доме.

Дыскусію мадэраваў Павол Дэмеш, кіраўнік беларускай праграмы German Marshall Fund. У ёй прынялі ўдзел беларускія мастакі Алесь Шатэрнік і Алесь Марачкін, каардынатар супольнасьці „Трэці шлях" Павел Марозаў, праваабаронцы Ірына Красоўская і Таццяна Процька, епіскап Наваградскі і Паўночна-Амерыканскі Святаслаў. У дыскусіі таксама ўдзельнічаў першы амбасадар ЗША ў Беларусі Дэвід Суорц.

„Палітыка ў дачыненні Беларусі павінна быць збалансаванай. І калі Еўрапейскі Саюз выбірае палітыку дыялогу з беларускімі ўладамі, то Злучаныя Штаты і пры новай адміністрацыі павінны захоўваць прынцыповы і каштоўнасны падыход да Беларусі, быць адвакатам свабод і правоў чалавека ў маёй краіне", — адзначыў Павел Марозаў.

„У Беларусі, нягледзячы на абвешчаную лібералізацыю, становішча ў сферы беларускай культуры і мовы не стала лепш: драматычна памяншаецца колькасць навучэнцаў на беларускай мове, дзеячы культуры, якія маюць крытычнае дачыненне да таго, што адбываецца ў краіне, выцясняюцца з авансцэны. Сітуацыя нічым не лепш, чым у Савецкім Саюзе, і працягвае пагаршацца", — заявіў Алесь Марачкін.

Колькасць удзельнікаў дадзенага мерапрыемства ўдвая перавысіла папярэдні прагноз. Прысутнічала больш за 60 чалавек, прадстаўнікі трынаццаці дыпламатычных місій, акрэдытаваных у Вашынгтоне, прадстаўнікі Рады БНР, шмат маладых беларусаў ЗША і Канады.

Выстава „Мастацтва супраць дыктатуры" — гэта сумесны праект шэрагу беларускіх ініцыятыў дыяспары, які рэалізуецца пад эгідай Кангрэса новай дыяспары Еўропы і ЗША. Выстава складаецца з 30 прац беларускіх мастакоў і скульптараў, і задуманая як перасоўная экспазіцыя.

У выставе бяруць удзел працы беларускіх мастакоў Алеся Шатэрніка, Алеся Марачкіна, Міколы Купавы, Рыгора Батальёнка, Генадзя Драздова , Юрыя Платонава, Янкі Рамановіча і Юліі Шатэрнік.

Раней яна экспанавалася ў эстонскім парламенце, далей плануецца яе паказ у Амерыцы, Канадзе, Скандынавіі і іншых краінах. Арганізатарамі выставы выступілі супольнасць „Трэці шлях", Беларускі моладзевы рух Амерыкі і Беларускі музей у Нью-Йорку. Выстава стала магчымай пры падтрымцы Агенцтва ЗША па міжнародным развіцці (USAID), German Marshall Fund of the United States, эстонскай няўрадавай суполкі „Valgevene Uus Tee", фонду „Адкрытая Эстонія" і іншых партнёрскіх арганізацый.

www.3dway.org
www.belmov.org
www.belmuseum.org

Са стрэльбай на карэспандэнта!

Мікола Краўчук усміхаецца на ўсе свае белыя зубы. Даўно не пісаў быў у „Ніву", а пяро аж свярбела! А пісаў жа ж ад самога пачатку існавання нашага тыднёвіка, ад стварэння беларускага літаратурнага аб'яднання. І не думаў быць літаратарам. Калі б не жыццёвыя клопаты, навука, праца, сям'я, — больш сур'ёзна ўзяўся б да пісання. Бо лёгка пісалася яму. І сатырычныя вершы і допісы („нарадзілася" і патоцка-тапалянская „Цётка Міхаліна", у адказ на сваяка з Малынкі „Дзядзьку Кваса" ды „Цётку Мальвіну" з Бельска), і сур'ёзныя інфармацыі. А як пісаўся такі верш?

— Здаралася, што раптам штосьці на мяне находзіла, браў пяро, ліст паперы, навейваліся думкі... Адно запісвай... А праз нейкі час... чытаў тое ў „Ніве"! Нават не памятаў, што выслаў свой тэкст Валкавыцкаму! Можа, сын падабраў напісанае дый выслаў? Можа, здасца гэта смешным, але пасля на тое адказам быў... ганарар. Можа, не такі і вялікі, але жонка ўжо не магла падсмейвацца, што парожне правёў я час.

Мікола Краўчук часу не марнаваў, і цяпер не марнуе, хоць ужо на настаўніцкай пенсіі разам з жонкай Зояй. Ездзяць у свае Тапаляны ці Патоку. Уся ваколіца ім знаёмая. І пісалася найбольш пра той міхалоўскі бок.

— А „Ніва" была „пачытная" газета! Герой майго допісу ездзіў на маторы па ўсёй ваколіцы — заехаў быў у Юшкаў Груд, Бандары, Міхалова, Ялоўку... І ўсюды выкупіў усе экземпляры „Нівы". Хацеў аперадзіць народ, каб яе не купіў. І не даведаўся пра яго канфуз!

Гэта той самы герой, пра якога Краўчук напісаў, што „точка ў точку як свіння". І, відаць, да народа паспеў ужо дайсці той вершык-фельетончык пра прыгоду віднага ва ўсёй гміне дзядзькі, які апынуўся ў незайдросным, бо свінскім становішчы. Жарт быў таксама і ў самім загалоўку, дзе ў спецыяльным русізме хавалася і імя дэліквента. А ніўскія чытачы чытаюць дакладна ўсё, нават надрукаванае і найменшым шрыфтом (нават і ў недарослай „Зорцы"!) і ахвотна рассакрэчваюць усялякія рэбусы. А асабліва чытач задаволены, калі раскрые штосьці, што сарамліва схавана, вартае зганьбавання. Значыць, ужо пакуль дайшло да ўсведамлення героя, што аб ім гаворка ў найнавейшым нумары „Нівы", той нумар, нават адзін экземпляр, што ўхаваўся ад пільнага вока раз'ятранага дзядзькі са стрэльбай, абняславіў ягоную смешную прыгоду.

— Паехаў быў пан Т. на рынак у Міхалова купіць парасят. Быў ён на віднай пасадзе ў гміне, але, жыўшы ў вёсцы, вёў з жонкай гаспадарку — меў карову, свіней... Пакуль аформіў справу, напіўся дапавалу. Людзі не змаглі нават пасадзіць яго на воз, дык увапхнулі ў скрыню для парасят. А конь сам пацягнуў воз дадому. Ой, рогат быў на рынку! Прывёз конь воз у сваю вёску, выбегла дзіця з жонкай пана Т.: „Мама, тата парасятак прывёз!" А жонка ўзлавалася: „Ну, точка ў точку: як свіння!".

У жартаўлівым тэксце ніўскага карэспандэнта не былі зафіксаваны ні прозвішча героя, ні назвы мясцовасцей, але ніці вялі ў Патоку да пана настаўніка, які быў вядомым аўтарам. Вядома, за такую знявагу пан Т. абяцаў крывавую расправу. Пры сустрэчах, якіх ім не было як мінуць, наліваўся чырванню і лаяў суседа за некарэктнасць. Гэта, вядома, яшчэ больш смяшыла жыхароў ваколіц Міхалова. А карэспандэнт і вухам не павёў — ці ж гэта пра вас было, паночку Т.? Урэшце рашыў герой славутага допісу кончыць гэтую гмінна-газетную камедыю.

— Пры сустрэчы ў Жэдні папрасіў, каб мы пагадзіліся. Ён мне, вось, дараваў! Ды ж я не яго самога клеймаваў, а ягоную загану — п'янства. І пісаў я дзеля таго, каб чалавек абразумеўся, кінуў піць... Эт, сам даеш парады, але ж вядома, у нас у ваколіцы ніхто за каўнер не выліваў!

Запрасіў пан Т. карэспандэнта да сябе на хутар, гадзіцца. Жыў ён на ўскраіне лесу, у прыватным драўляным доме. Узяў Мікола пляшку на згоду, запрог каня, сеў у сані і паехаў на суседні хутар. Пан Т. запрасіў яго за багата застаўлены стол, бабахнуў першы буталь...

— Жонка пана Т., якой словы сталі загалоўкам майго верша, наставіла на стол вяндлін з дзічыны, завіхалася. Відаць было, што рада была майму допісу, — мела надзею, што паэзія ўразуміць яе мужа! Ды за першай пляшкай пайшлі наступныя. Спачатку мы даравалі адзін аднаму, нават абняліся, чмокнуліся на згоду. Ды пасля чарговай бачу, што робіцца няладнае. Выйшаў я быццам на двор, кажу суседу, што чагосьці заглянуў на падворак, каб мае сані адвёў пад лес. Вяртаюся, а чырвоны як індык гаспадар раве: „Я табе гэтай ганьбы не дарую! Заб'ю як сабаку!" Выскачыў на калідор, схапіў стрэльбу са сцяны! А я дзыг! — на двор! Выбіў стрэльбу з рук пана Т., і ў ногі. Той упаў, сарваўся, і давай страляць па мне! Добра, што моцна выпіўшы быў, бо валіў куды папала — то сабе ў страху, то ў плот! Мае сані былі ўжо пад лесам, дык я на ляту ўскочыў на іх і папёр дадому!

Карэспандэнт смяецца, але нават і пасля аповеду аж выцірае лоб! Прыйшлося тады папацець! Жонка лагодна матляе галавою, — не адзін раз „падпаў" муж-паэт і некаторым героям, і мабыць і ёй самой. Чалавек жа ж жывы, усё можа прытрапіцца. Калі ціха сядзіш, дык менш цябе відна. А чалавеку бываламу хочацца ўбачыць яшчэ больш, і падзяліцца ўбачаным. А тут відаць было як на далоні — чытаюць людзі і „Ніву", і допісы Міколы Краўчука, а адгалоскі якія — гучныя як стрэл з ружжа! Не толькі на ўсю Міхалоўскую гміну!

Міра ЛУКША

Што не можа не цешыць апошнім часам у Байнэце, то гэта з'яўленне царкоўных праваслаўных сайтаў з беларускай моўнай версіяй. Вельмі прыемна ўсведамляць, што беларуская мова, аказваецца, не такая ўжо нягеглая, якой яе выстаўляе цяперашні беларускі прэзідэнт, што з'яўляецца мовай, на якой можна разважаць пра Бога і, нават, звяртацца да Яго. А калі яна ўжо для гэтых мэт пасуе, то і ў штодзённым жыцці беларусаў мусіць быць для яе месца, тым больш, што ў шэраг мёртвых моў беларуская пакуль не занесена.

Мінскі прыход іконы Божай Маці „Усіх тужлівых радасць", пэўна, далей за астатніх прасунуўся ў справе беларусізацыі царкоўна-праваслаўнага жыцця. Сведчаннем гэтаму з'яўляецца сайт прыхода http://www.sobor.by/belarus.php, дакладней, яго беларускамоўная версія.

Выглядае сайт даволі строга, і ў той жа час арыгінальна. Як і належыць духоўнаму інтэрнэт-парталу, ён не надта аздоблены рознымі ўпрыгожаннямі, але спалучэнне колераў — белы, зялёны і карычневы — надаюць выяўленню нейкую спакойную прыцягальнасць.

Размяшчэнне выйсцяў да розных рубрык сайта па традыцыі месціцца з левага боку, на зялёным полі. Варта адзначыць, што рубрык тут даволі многа і практычна кожная з іх насычана карыснай інфармацыяй. Праўда, многае з таго тычыцца выключна Мінска ці данага прыхода, але ёсць старонкі на якіх варта засяродзіць агульную ўвагу.

Адной з такіх старонак з'яўляецца „Турэмная царква". Цяжка ўявіць той момант жыцця чалавека, калі б не трэба яму думаць пра Бога, але месца знявалення — гэта тое месца, якое прызванае быць у нечым падобнае на царкву, бо людзі павінны выходзіць адтуль ачышчаныя і парваўшыя з цяжкім мінулым. Канешне, у жыцці сучаснай постсавецкай Беларусі такое адбываецца вельмі рэдка, таму і знаходзіцца яна ў шэрагу краін-лідараў па колькасці зняволеных на душу насельніцтва. Мабыць, наяўнасць турэмных цэркваў стане ў рэшце рэшт адным з чыннікаў ачышчэння ад мінулага і цяперашняга бруду цэлай Беларусі.

Рубрыка „Іконы, капліцы" змяшчае вялікі тэкст пра ікону Божай Маці „Усіх тужлівых радасць". „Усіх тужлівых радасць, і пакрыўджаных Заступніца, і галодных Карміцельніца, туляг суцяшэнне, абураемых прыстанак, хворых наведванне, нямоглых покрыве і Заступніца, жазле старасці, Ты Маці Бога Вышняга, Прачыстая: спрыяй, молімся, уратаваца рабам Тваім", — такімі словамі звяртаюцца тамтэйшыя прыхаджане да данай святыні. Далей ідзе падрабязны расповед пра гісторыю, звязаную з іконай, арыгінал якой знаходзіцца цяпер у Санкт-Пецярбургу.

Найцікавейшай старонкай падаецца рубрыка „Значныя падзеі". Тэксты аб прынясенні мошчаў Андрэя Першазванага ў Мінск наўрад ці пакінуць без добрых пачуццяў віртуальнага наведвальніка прыхода.

Далей у пераліку рубрык ідуць аповеды пра жыцці святых. Тут мы знойдзем інфармацыю пра Еўфрасінню Полацкую, Кірылу Тураўскага, пакутніка Уладзіміра Хіраску, Андрэя Першазванага, князёўну Вольгу і многіх іншых, якія могуць быць маякамі ў жыцці простых веруючых людзей.

Заканчваюцца рубрыкі акафістам прападобнай Еўфрасінні Полацкай, якая яшчэ завецца свяціцелькай усёй Беларусі.

Уладзімір ЛАПЦЭВІЧ

Беларусь,беларусы...

Марудныя лыжы

Чэмпіянат свету па біятлоне, які завяршыўся ў Карэі, так і не прынёс нашым прадстаўнікам медальнага п'едэстала. У жаночай індывідуальнай гонцы на 15 км лідарка беларускай каманды Дар'я Домрачава да апошняга агнявога рубяжа прэтэндавала на высокае месца, але пры чацвёртай стральбе не разбіла яшчэ адной талерачкі (усяго ў яе пасіве было тры недакладныя стрэлы) і ў выніку спынілася на 11-й пазіцыі. Іншыя беларускі выступілі так: Надзея Скардзіна — 32-е месца, Вольга Назарава — 33-е, Вольга Кудрашова — 48-е. Усяго стартавала 109 біятланістак. Свой чарговы чэмпіёнскі тытул здабыла Каці Вільхельм з Нямеччыны. Серабро дасталася славенцы Тэі Грэгарын, якая доўга ішла да гэтага поспеху, бронзавы медаль павесілі на шыю дасведчанай нарвежкі Туры Бергер. Найбольшыя шанцы на ўзнагароду былі ў беларускай жаночай каманды ў эстафеце. Але высілкаў адной Домрачавай зноў не хапіла. „Марудныя лыжы" іншых прывялі нашых толькі на 4-е месца. Дзяўчаты абышліся без штрафных кругоў, выкарысталі 8 дадатковых патронаў, дарэчы, менш чым пераможная зборная Расеі, але, як звычайна, не былі хуткімі на дыстанцыі. Серабро перапала немкам, бронза дасталася французжанкам. Усяго старт бралі 24 краіны. У гэты ж дзень мужчынскую гонку масавага старту выйграў аўстрыец Дамінік Ландэрцінгер. Другім быў яго суайчыннік Крыстоф Зуман, трэцім — расеец Іван Чэразаў.

У апошні дзень спаборніцтваў у жаночым масстарце Дар'я Домрачава была 6-й, двойчы не трапіўшы ў мішэнь. Для Вольгі Назаравай гонка не склалася — яна фінішавала 26-й з 30 удзельніц. Трыо прызёраў тут сфармавалася так: Вольга Зайцава (Расея), Анастасія Кузьміна (Славаччына), Хелена Юнсан (Швецыя). А сапраўдным упрыгожаннем форуму стала мужчынская эстафета, якая прынесла золата Нарвегіі. Яго фінішным спуртам на апошнім этапе прынёс, канешне, Уле-Эйнар Б'ёрндален. Тытул віцэ-чэмпіёнкі здабыла Аўстрыя, у Нямеччыны бронзавы медаль. Нашы біятланісты зусім правалілі гонку, стаўшы толькі 19-мі з 26 удзельнікаў. Так што выступ беларускіх мужчын ніжэй усялякай крытыкі. Калі Сяргей Новікаў і Рустам Валіулін, змагаючыся з апошніх сіл, паказвалі перыядычна нешта прыстойнае, то іншыя былі проста няздольныя на сур'ёзны вынік. І не прыгадаць, калі нашы біятланісты падалі так нізка ўвогуле і ў эстафеце ў прыватнасці.

А ў старажытным чэшскім горадзе Ліберэц у разгары чэмпіянат свету па чыста лыжных дысцыплінах. На гэты форум прыехала ажно 635 лыжнікаў, скакуноў з трампліна і двухборцаў з 62 краін. Беларуская каманда складаецца з чатырох лыжнікаў, пяцёх лыжніц і Івана Собалева, які выступіць у двухбор'і. У мужчынскай гонцы на 15 км класічным стылем выйшаў адзін беларус Аляксандр Лазуткін, які заняў 60-е месца пры 75-і стартаваўшых. Чэмпіёнам тут стаў дасведчаны эстонец Андрус Веерпалу. Беларускі ветэран Аляксандр Далідовіч пры 92 удзельніках стаў 26-м у дуатлоне — гонцы, дзе палову 30-кіламетровай дыстанцыі лыжнікі мусяць прайсці класічным стылем, а другую — вольным. Аляксандр Лазуткін фінішаваў 35-м. Чэмпіёнскія лаўры ўсклаў на сябе нарвежац Петэр Нуртуг. У аналагічнай жаночай гонцы наша Алена Саннікава дасягнула неблагога выніку — 22-е месца, 39-я пазіцыя ў Вольгі Васілёнак. А выйграла дуатлон Юстына Кавальчык з Польшчы. Шанцы ж нашых на сур'ёзны поспех на гэтым першынстве больш чым прывідныя.

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Урок гісторыі

Замак у Рэшлі

Зімовыя канікулы гэта час, калі хочацца адпачыць і наведаць новыя месцы. І мы вырашылі паехаць у свет. Цяпер вельмі модныя паездкі ў краіны Еўрасаюза, але хачу пераканаць, што і ў Польшчы многа месц, якія трэба наведаць, прытым такое падарожжа не з'яўляецца надта каштоўным.

Мазуры — польская назва Краіны Вялікіх Азёр. Чароўнае месца, дзе знойдзем моцныя гістарычныя весткі, а таксама цудоўна адпачнём.

Выезд з Беластока ў напрамку Элка. Можна ўжо адчуць, што мы выехалі па-за межы Падляшша, хаця яшчэ гэта наша ваяводства. Дарогі штораз больш пакручастыя, а навокал лугі. Ні лясоў, ні кустоў, толькі шырокая прастора — проста няма дзе схавацца. Кіруемся на Монькі. Першы прыпынак робім у Кнышыне. Там стаіць памятка чыгуначнага транспарту. Далей пераязджаем праз раку Бебжу. Тут спыняемся ля самай ракі і наведваем абарончыя муры ў Асоўцы — царскі аб'ект з пералому XIX/XX стагоддзяў, які мае неверагодна стабільную структуру.

Працяг нашай дарогі пралягае праз недалёкі драўляны масток. Цікавіць нас вудзільшчык, які ў марозны дзень спецыяльна падрыхтаванай вудай ловіць з-пад лёду рыбу. А мы хаваемся ў цёплы самаход і кіруемся да наступнага пункта экскурсіі. Праз мясцовасць Просткі вядзе нас брукаваны тракт. Нарэшце даязджаем у Элк. Пры ўездзе вітае нас вока возера — мы ў свеце цудаў і вадзянікоў.

Пераязджаючы праз Гіжыцка, мы вырашылі скараціць дарогу і паехаць праз Вашчэлі і Стасьвіны. На жаль, мы не ведалі, што нас чакае: пры самой дарожцы растуць вялікія вольхі. Круцімся то ўправа, то ўлева, кашмар! Да таго няма дарожных указальнікаў. У выніку ехалі мы даўжэй, чым наўкола. Узнагародай за нашы пакуты была панарама, якая паўстала перад Гіжыцкам: возера Нягоцін і мазурскі краявід. Позняя пара накіравала нас у Кентшын.

У наступныя дні мы наведалі: у Кентшыне, замак і гатычны касцёл; на поўдзень ад горада — Марыйны санктуарый у Святой Ліпцы; на захад — Рэшаль з замкам XVI ст, на поўнач — у Ружанцы галандскі вятрак з 1863 г. і на ўсход — кватэру Гітлера ў Герлажы. Пры ёй мы спыніліся, а гісторык Торуньскага ўніверсітэта выклаў нам урок гісторыі пра „Воўчае логава". Адказваючы на многія пытанні, спадар Я. Зажэцкі расказаў пра матывы ўзвядзення сховішчаў у чыстым лесе і паводзіны нямецкіх афіцэраў і самога фюрэра. Герлаж выглядаў як мясцовасць пад зямлёю — усё было замаскаванае, спецыяльна пасаджаныя дрэвы, а ўсярэдзіне ўсе выгады: і спальня, і ўмывальня, і кіно, і магазіны, і радыёцэнтр, і пошта, і лекары, і нават цырульня, а ўсё ў найвышэйшых стандартах. Муры мелі 8 метраў таўшчыні, а каля 50 — у непасрэднай зоне аховы правадыра. У гэтай крэпасці нямецкі канцлер загадаў рэалізаваць ідэалогію змешчаную ў кніжцы „Майн кампф", напісанай у турме. А зводзілася яна да таго, каб мардаваць яўрэяў ды славян і такім чынам расчысціць тэрыторыю для „чыстай расы" — арыйцаў. Тут таксама палкоўнік Клаўс фон Штаўфенберг прабаваў забіць Гітлера. Замах на жыццё не ўдаўся. Гітлера выратавала сустрэча з Мусаліні і скарочаны час штабной нарады. Пасля ўсё ўзарвалася ў паветра. Сёння мы — турысты — наведваем руіны бункераў, а дакладней таго, што захавалася.

Урок гісторыі канчаецца, каб крышку адпачыць. Пераязджаем у Мікалайкі, дзе ў гасцініцы „Галамбёўскі" знаходзяцца аквапарк і многія атракцыёны. Вяртаючыся дахаты, мы былі на найбольшым у Польшчы возеры Снярдвы.

Пабываючы на Мазурых магчыма наведаць намнога больш і тым самым даведацца пра гісторыю, традыцыю і жыццё жыхароў Краіны Вялікіх Азёр. Заахвочваю зрабіць сабе такую экскурсію, якая не патрабуе многіх намаганняў, ні грошай. Варта таксама паехаць у недалёкі Ольштын, але гэта на наступных канікулах. Час вяртацца да штодзённых спраў.

Альжбета РАМАНЧУК

Вечар у гонар Язэпа Найдзюка

У Беларускім культурным таварыстве „Хатка" ў Сопаце 21 лютага 2009 г., у запускны вечар, адбылася вечарына, прысвечаная 25-й гадавіне з дня смерці Язэпа Найдзюка — беларускага нацыянальнага і культурнага дзеяча, друкара, дырэктара друкарні ў Інаўроцлаве.

З дакладам пра славутага беларуса выступіла старшыня БКТ „Хатка" д-р Лена Глагоўская. Засяродзілася яна на найважнейшых фактах з багатага ў падзеі жыцця Язэпа Найдзюка, а з 1944 г. — Юзафа Александровіча. Каб пражыць, пасля вайны Язэп Найдзюк, як і іншыя беларускія дзеячы актыўныя на нацыянальнай ніве ў час нямецкай акупацыі, мяняе прозвішча на Александровіч і, каб праз сям'ю і сяброў не выявіла яго тайная палітычная паліцыя, парваў кантакты з найбліжэйшымі.

Інаўроцлаў для ўшанавання памяці заслужанага таксама і для польскай культуры дзеяча ў 2004 годзе адкрыў мемарыяльную дошку на сцяне друкарні, якой многа лет кіраваў Юзаф Александровіч (Язэп Найдзюк). Дзякуючы даследчыцкай працы д-р Лена Глагоўская вярнула сучасным памяць не толькі пра Язэпа Найдзюка, але і іншых выдатных беларусаў.

У сустрэчы прысутнічала як беларуская студэнцкая моладзь, так і пажылыя жыхары Трыгарада.

М. К.

Ці непатрэбныя вясковыя сходы?

Чаромхаўская гміна штогод у лютым арганізавала вясковыя сходы. Войт знаёміў насельніцтва з рэалізацыяй леташняга бюджэту ды інвестыцыйнымі планамі на бягучы год, а і самі сяляне маглі выказаць свае заўвагі ў адрас гмінных чыноўнікаў. Але ўжо другі год сустрэчы не ладзяцца. Прычыну трэба пэўна шукаць у „маштабным" фінансавым крызісе, але грамадскасць інакш гэта аргументуе: нічога не робіцца, таму і няма чым хваліцца. Войт прызнаецца, што не пад сілу (без еўрасаюзных сродкаў) рэалізаваць каштоўныя інвестыцыі, напрыклад, водаправод ці сцёкавую каналізацыю. Дагэтуль жыхары прыгранічных салэцтваў (Апакі-Вялікай, Пагулянкі, Беразышчаў, Зубач, Бабровкі і Янцэвіч) карыстаюцца вадой з калодзежаў, хоць гэтая ў сапраўднасці непрыгодная для спажыцця. Людзі наракаюць. Солтыс Зубач Дзмітры Асепскі праблему водаправода ставіў на сесіі Рады гміны ў снежні, але беспаспяхова. У адказ пачуў такое: дакументацыя на водаправод распрацаваная на Апаку-Вялікую і Пагулянку, вам прыйдзецца пачакаць. Такіх „балючых" спраў у сучаснай рэчаіснасці хоць адбаўляй. Варта затым паслухаць голас народа.

Уладзімір СІДАРУК

Адгаданка

1. збожжа на конскі ласунак, 2. эфіраносная расліна з моцным пахам і горкім смакам, 3. стаматалагічны аб'ект, 4. рэчка, на якой Семяноўскі вадаём, 5. канец жыцця, смерць, 6. „ты" ў множным ліку, 7. адлегласць паміж расшыранымі вялікім і малым пальцамі рукі, 8. колішняя адміністрацыйна-тэрытарыяльная адзінка ў сельскай тэрыторыі Расіі, 9. невялікае паглыбленне, 10. напр. Зямля, 11. польская гербавая птушка.

Адгаданыя словы запісаць у вызначаныя дарожкі, пачынаючы ад поля з лічбай. У светлых палях атрымаецца рашэнне — афрыканская пагаворка.

(ш)

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на адгаданку з 4 нумара

Вінт, Данія, клас, мяса, Нява, світа, цар.



Рашэнне: **Ад нянавісці няма лякарства.**

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Яну Міхалюку** з Чыжоў і **Казіміру Радошку** са Свебадзіцаў.

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
Старшыня: Яўген Вапа.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 84.
Тэл./факс: (+48 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl/*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*
Zrealizowano przy udziale wsparcia finansowego Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji.

Галоўны рэдактар: Яўген Вапа.
Намеснік гал. рэдактара: Віталь Луба.
Тэхнічны рэдактар: Адам Паўлоўскі.
Рэдактар „Зоркі": Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Ілона Карпюк, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Мацей Халадоўскі, Віктар Сазонаў, Уладзімір Хільмановіч, Міхась Сцепанюк.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Друкарня: „Orthdruk", Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.

Prenumerata krajowa
Termin przyjmowania wpłat do 5-go dnia każdego miesiąca poprzedzającego okres rozpoczęcia prenumeraty. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie województwa podlaskiego oraz oddziały „RUCH" i „KOLPORTER" na terenie całego kraju. Cena prenumeraty kwartalnej — 26 zł., półrocznej — 52 zł., rocznej — 104 zł.

Prenumerata z wysyłką za granicę
Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A. Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa; telefony: +48(0)22 53-28-823 — prenumerata płatna w walucie obcej, 0-2253-28-816, 53-28-819; — prenumerata płatna w PLN; nr faxu: 0-2253-28-734

Prenumerata w redakcji
Planowana ilość numerów „Niwy" w 2009 roku — 52.

Poczta zwykła: Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,65 zł. Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę — kraje europejskie — 5,00 zł. — kraje pozaeuropejskie — 5,20 zł.

Poczta lotnicza: Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę: — kraje europejskie — 6,00 zł, — Ameryka Północna, Afryka — 6,70 zł., — Ameryka Południowa — 7,80 zł., — Australia i Oceania — 10,00 zł.
Wpłaty przyjmuje:
Rada Programowa Tygodnika „Niwa",
BANK PEKAO S.A. O/Białystok
38 1240 5211 1111 0000 4929 0945

Nakład: 1 500 egz.

Ёсць такія вечары ў Нарве

Тэкст і фота Міхася СЦЕПАНЮКА

Нарва, 13 лютага, 16:30. У адной з залаў мясцовай школы сабраліся дзеці, якія вучацца беларускай мове, ды іхнія бацькі. На тварах многіх вучняў відавочнае хваляванне. Вядома, часам так бывае перад выступамі. Яшчэ некалькі хвілін чакання і ўжо. Пачынаецца сустрэча „Ёсць такія вечары".

Акцёры-першакласнікі

Хаця часам хвалююцца, любяць выступаць

— Сардэчна вітаем бацькоў, вучняў ды гасцей, — пачынаюць мерапрыемства вядучыя Уля Беразавец і Караль Лукша.

Арганізатар вечарыны настаўніца беларускай мовы Ніна Абрамюк тлумачыць, што мэтай сустрэчы з'яўляецца інтэграцыя настаўнікаў, бацькоў і дзетак. Мерапрыемства ўпісваецца таксама ў традыцыю г.зв. *мэсніцаў* — вечароў, падчас якіх суседзі наведваюць адзін аднаго, каб пагаварыць і павесяліцца.

— На вечарыне дзеці паказваюць тое, чаго навучыліся, пачынаючы з верасня, — дадае спадарыня Абрамюк, якая вучыць роднай мове ўсіх выступаючых на мерапрыемстве.

Праграма сустрэчы даволі багатая. Першымі з п'есай „Калядны вечар" выступаюць першакласнікі. Цікавае, што наймалодшыя навучэнцы самі ўносяць посуд і стравы на калядны стол. Пасля акажацца, што падрыхтоўка каляднага стала не перад п'есай, а падчас выступлення была ідэяй саміх першакласнікаў.

Пасля наймалодшых акцёраў перад публікай прэзентуюцца вучні старэйшых класаў. Трэцякласнікі выступілі перад публікай з п'есай „Каляды ў сям'і Ады", а чацвёртакласнікі — з „Мухай-пяюхай". Артыстычную частку завяршаюць найстарэйшыя, а менавіта вучні VI класа, якія паказалі гумарыстычнае прадстаўленне „Тамара хоча замуж". Вечар узбагацілі сольныя нумары вучняў, якія з вялікай ангажаванасцю дэкламавалі вершы і казкі.

Настаўніца беларускай мовы Ніна Абрамюк

— Свае выступы рыхтуем на ўроках і пасля заняткаў, — тлумачыць настаўніца Ніна Абрамюк. Паводле яе, дзеці, асабліва наймалодшыя, вельмі ахвотна прымаюць удзел у падрыхтоўцы сцэнічных выступаў, а таксама і ў саміх прэзентацыях. Пацвярджаюць гэта самі вучні.

— Таааааак!!!! — згодна і голасна адказваюць першакласнікі на пытанне ці любяць выступаць у беларускіх прадстаўленнях.

На сцэну ахвотна выходзяць таксама шасцікласнікі. Свае п'есы паказвалі яны ўжо раней, між іншым, у Ласінцы, Трасцянцы, Тыневічах. Апрача прадстаўлення „Тамара хоча замуж" паказалі яны таксама абрадныя сцэнкі (між іншым, велікодныя і хрысцінныя).

Вучні і бацькі напэўна думаюць ужо пра падобную сустрэчу ў будучыні

— Любім гэтае, але часам стамляе хваляванне, — усміхаецца Уля Беразавец, якая апрача канферансу выступала ў п'есе „Тамара хоча замуж". Думка, каб падрыхтаваць больш гумарыстычнае прадстаўленне паўстала ў супрацоўніцтве з настаўніцай.

Варта вучыцца беларускай мове

Ідэя арганізаваць гэтага роду сустрэчы ў Нарве ўзнікла гадоў два таму назад.

— Бацькі запрапанавалі, што варта было б рабіць такія вечарыны, бо гэта нас інтэгруе, — расказвае Ніна Абрамюк. — Сённяшняя сустрэча накіраваная асабліва да бацькоў першакласнікаў, якія ўпершыню могуць паглядзець выступы сваіх дзяцей.

Мерапрыемства „Ёсць такія вечары" адбываецца таксама пры актыўнай дапамозе бацькоў, якія падрыхтавалі, між іншым, пачастунак.

— Вельмі люблю аглядаць выступы майго сына, — гаворыць мама аднаго з вучняў. Паводле яе, Ніна Абрамюк увесь час прапануе сваім вучням атракцыйныя формы навукі беларускай мове: сустрэчы, экскурсіі. Ад некалькіх гадоў сустрэчы бацькоў, настаўнікаў ды вучняў адбываюцца супольна з пачатковай школай ды гімназіяй з Гарадка. Даюць яны бацькам нагоду актыўна дапамагаць і ўдзельнічаць у жыцці школы.

Вечарына „Ёсць такія вечары" мае яшчэ адну мэту: паказаць бацькам, што варта было запісаць дзяцей на заняткі беларускай мовы. А што ўрокі ведзеныя па-беларуску цікавыя і атракцыйныя можа даказаць прыклад Ады Гуральчук. Дзяўчынка, якая сёння вучыцца ў трэцім класе, у Нарву прыехала з Беластока і сама захацела вучыцца беларускай мове.

— Усе тут размаўлялі па-свойму і я таксама захацела так размаўляць, — тлумачыць Ада, якая не толькі прымала ўдзел у п'есах, але сола праспявала „Купалінку".

Пасля заканчэння артыстычнай часткі вучні і бацькі дзеляцца ўражаннямі і напэўна думаюць ужо пра падобную сустрэчу ў будучыні, бо вядома: такія вечары ёсць толькі ў Нарве!

Вядучыя Уля Беразавец і Караль Лукша

САКАВІК 2009

(22.03. — 20.04.) У сакавіку ўсе адносіны з іншымі капітальна разладзяцца. Нявыключана наступленне веснавой дэпрэсіі, ды хутка ўсё паправіцца. Пасля 20.03. пачнецца новае жыццё, новы творчы перыяд. Да таго часу мусіш завяршыць незакончаныя справы і пааддаваць даўгі.

(21.04. — 21.05.) Можаш прыступіць да новых праектаў. Усё паправіцца дзякуючы шчасцю, ды веснавая дэпрэсія і цябе не міне. Справіцца з ёю памогуць падарожжы, якія будуць выключна прыемнымі.

(22.05. — 22.06.) Заваляць цябе прапановамі і перспектыўнымі праектамі. Ва ўсім чакаюць цябе поспехі. Сябры і калегі памогуць табе бескарысліва і сардэчна.

(23.06. — 23.07.) У сакавіку Ракі пачнуць новае жыццё. Знойдуць вырашэнне праблем так у прафесійных справах, як і ў хатніх. Усё атрымаецца, калі будзеш верыць інтуіцыі. Магчымыя лёсавырашальныя сустрэчы ў карысных паездках.

(24.07. — 23.08.) Не зусім просты чакае цябе месяц! З аднаго боку будзеш на вышыні, на працы паімправізуеш і наляту вырашыш найцяжэйшыя заданні, з другога — будзеш адчуваць ціск і адлучэнне ад калектыву; гэта з-за авітамінозу ды стомы.

(24.08. — 23.09.) У гэтым месяцы прыйдзецца табе вырашаць шэраг прафесійных і бытавых праблем. Чым больш сур'ёзна да іх паставішся, тым хутчэй знойдзеш іх вырашэнне. Знойдзе цябе і вялікая работа. Не разлічвай на просты поспех!

(24.09. — 23.10.) У сакавіку працяг тэндэнцыі з лютага. Атачэнне яшчэ ўзмоцніць ціск на цябе. Ды не паддасіся, прымяняючы тактыку разумнага эгаізму.

(24.10. — 22.11.) Можаш памяняць від дзейнасці. Гэта можа быць новы праект ці агульна іншы занятак. Важная ў гэты час выразная выканаўчая дысцыпліна. Мусіш не толькі здабыць добрыя вынікі, але і захаваць іх. Паправа ў матэрыяльным плане. Чакае цябе прыемная неспадзяванка, звязаная з малодшым пакаленнем.

(23.11. — 22.12.) Будзь асцярожны з малазнаёмымі; магчымыя ашуканствы і выкарыстанне. Займіся лепш выкованнем меўшыхся праектаў, а новыя пачаткі адтэрмінуй.

(23.12. — 20.01.) Знойдзешся ў цэнтры ўвагі. Зрэалізуеш усе кантакты, якія будуць табе прапанавацца. Можа здарыцца патрэба высвятлення пазіцый з кіраўніцтвам. Справішся з усімі справамі ды нават можаш атрымаць падзяку за сваю спагаду і дабрыню.

(21.01. — 19.02.) Па чарзе будзеш рэалізаваць справы і высвятляць адносіны. Жыццё стане спакайнейшым, ды нянудным. Спраў, як і раней, шмат. Пры канцы месяца, на падставе ўжо выкананага, могуць узнікнуць новыя планы.

(20.02. — 21.03.) Нават не падазраваўшы, што ты пераборшчыў з работай, будзеш паказваць прыкметы стомленасці. У выніку гэтага можаш страціць здабытыя ўжо пазіцыі. Каб так не сталася, мусіш уперамежку займацца працай і адпачынкам. Траўманебяспечны час. Асабліва будзь асцярожны за рулём!

Агата АРЛЯНСКАЯ

ISSN 0546-1960